ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 38 (4290)
Пакядзелак, 15 лютага 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

ПЕРАДАВАЯ: Пастановы XIV зьезду КП(б)Б і XVII партканфэрэнцыі — у масы.

Рашуча змагацца з кулацкай дзяльбой і асяданьнем ільну (1-я стар.). Мабілізаваць калгасныя масы на ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4-га лютага (1-я стар.). Першая дэкада лютага ня дала пералому (1-я стар.).

АРТЫКУЛЫ: А. ХАЦКЕВІЧ. — Выкананьне фінпляну 1932 г. — неадлучная частка барацьбы за другую пяцігодку. А. ІВІН. — Гераічная барацьба кітайскай Чырвонай арміі (4-я стар.).

Народна-гаспадарчы плян 1932 г. і задачы ЦКК-РСІ (рэзалюцыя IV пленуму ЦКК УсеКП(б) ад 10-га лютага 1932 г. па дакладу тав. Я. З. Рудзутака) (2-я стар.). Марксыцка-ленінскае выхаваньне партыйных мас — важнейшая зброя ў барацьбе за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва (2-я стар.). ТАВАРНУЮ ПРАДУКЦЫЮ СКТФ — ДЗЯРЖАВЕ (3-я стар.). ПЯЦЬ ГОД БДТ-2 (3-я стар.). АГЛЯД ДРУКУ. — Рухавікі калгаснай вытворчасьці (3-я стар.). АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ ЗАГАТОЎЧАГА АПАРАТУ — Пастанова СНК СССР (3-я стар.).

ПАСТАНОВЫ XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б і XVII УСЕСАЮЗНАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ—У МАСЫ

Уся краіна з гіганцкім, нябывалым ўздымам спаткала пастановы XVII усесаюзнай канфэрэнцыі ленінскай партыі. Усе партыйныя арганізацыі, рабочыя і калгасныя масы горача вітаюць прынятую партыяй базвую праграму пабудовы сацыялізму ў нашай краіне. Гэты найвялікшы ўздым актыўнасьці мас яшчэ раз з выключнай сілай сьведчыць аб нязьмерным аўтарытэце партыі сярод пралетарыяту, калгаснага сялянства і ўсіх працоўных, іх гатоўнасьці ісьці пад кіраўніцтвам партыі да новых баёў і перамог за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Задачай усёй КП(б)Б, усіх партарганізацый зьяўляецца найглыбейшая прапрацоўка і папулярызацыя пастаноў XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі ў масах. Гэту прапрацоўку трэба разгарнуць на кожным заводзе і фабрыцы, у кожным саўгасе, калгасе і МТС, мабілізуючы рабочыя і калгасныя масы на барацьбу за бальшавіцкія тэмпы і якасьць работы па ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Наша партыя атрымала найвялікшыя перамогі ў будаўніцтве сацыялізму, наперакор шалёнаму супраціўленьню 1 прошукам клясавых ворагаў і іх апартуністычных агентаў. Да канца збанкрутавала і панярпела поўнае паражэньне буржуазная «тэорыя» трацкістаў аб немагчымасьці пабудовы сацыялізму ў нашай краіне. Трацкізм перарадзіўся ў перадавы атрад міжнароднай контр-рэвалюцыі. Да канца збанкрутавала і панярпела поўнае паражэньне кулацкая ідэалёгія правай апазыцыі.

Партыя вырашыла ленінскае пытаньне «хто каго» і ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы канчаткова супроць капіталізму, на карысьць сацыялізму. Пераможна завершана пабудова фундамэнту сацыялістычнай эканомікі. Створана асноўная база сацыялізму — буйная індустрыя. На гэтай базе ў другой пяцігодцы будзе завершана сацыялістычная рэканструкцыя ўсёй народнай гаспадаркі.

Мы разгромілі клясавага ворага і канчаткова падарвалі карэньні капіталізму на вёсцы, што правырвае поўную ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў і зьнічэньне клясаў у нашай краіне ў другой пяцігодцы.

Асновай асноў рэалізацыі гістарычных задач другой пяцігодкі зьяўляецца поўнае выкананьне праграмы 1932 году. Плян апошняга году першай пяцігодкі павінен быць ня толькі ВЫКАНАН, але і ПЕРАВЫКАНАН як па колькасных, так і па якасных паказальніках. Бягучы год павінен стаць годам рашучай барацьбы за максымальнае скарачэньне імпарту, за высокую якасьць прадукцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Галоўны ўпор — на якасьць, на павялічэньне прадукцыйнасьці працы і зьніжэньне сабекошту. Рэалізацыя шасьці ўмоў перамогі — шасьці ўказаньняў тав. Сталіна — адзіны шлях да пераможнага выкананьня і перавыкананьня праграмы 1932 году. «Мы павінны дабіцца таго, каб шэсьць гістарычных умоў тав. Сталіна былі ажыцьцёўлены не рэзалюцыямі, ня словамі, а справамі. Прасьцей за ўсё прыняць вялікую рэзалюцыю і гэтай рэзалюцыі ня выканаць. Шэсьць умоў тав. Сталіна трэба праводзіць канкрэтна і канкрэтна, трэба змагацца за іх правядзеньне на ўсіх вучастках работы» (Гікало).

Трэба яшчэ больш узмацніць барацьбу за далейшае паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы, разгортваючы лёгкую і харчовую індустрыю, савецкі гандаль, развіваючы камунальную гаспадарку і інш. У галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі важнейшай задачай зьяўляецца бальшавіцкая **рэалізацыя апошняй пастановы ЦК УсеКП(б) аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў.** Моцны адпор павінна сустракаць усякая спроба перайсьці ад арцельнай формы калгасаў да камуны на сучаснай стадыі калгаснага будаўніцтва. Максымум сіл і энэргіі трэба аддаць **умацаваньню брыгады,** як цэнтральнага зьвена ў арганізацыі працы ў калгасе.

«Сацыялізм, — пісаў Уладзімер Ільліч, — ёсьць зьнічэньне клясаў». Але клясы ня зьнікнуць самі сабой, ня зьдуць самацёкам з арэны гісторыі. Ленін вучыў партыю, што клясы зьнічаюцца толькі ў працэсе вострай клясавай барацьбы пралетарыяту. Другая пяцігодка зьяўляецца разгорнутай праграмай супартай і рашучай барацьбы за канчатковую ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў і зьнічэньне клясаў.

Ня ціха і плаўна, а ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы пралетарыяту мы пабудуем бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва. Перад намі стаіць трудная і складаная задача перавыхаваньня найшырэйшых працоўных мас, задача перамаганьня буржуазных і дробна-буржуазных тэндэнцый і настрояў сярод мільёнаў людзей.

Клясавы вораг у нашай краіне разгромлен. Але ён не дабіт. Капіталістычныя элемэнты ня будуць спакойна чакаць, скалаўшы рукі, пакуль мы іх канчаткова ліквідуем. Клясавы вораг з усіх сіл супраціўляецца пераможнаму наступленьню сацыялізму. Пытаньне «хто каго» ў міжнародным маштабе яшчэ ня вырашана. Капіталістычнае акружэньне СССР яшчэ застаецца фактам. Сусьветная буржуазія разам са сваімі сацыял-фашысцкімі збройнасцямі точыць нож, каб усадзіць яго ў сьпіну Савецкага Саюзу. Адсюль задача далейшага **ўмацаваньня пралетарскай дыктатуры.** Адсюль задача далейшага **ўмацаваньня нашай партыі.**

Толькі махровыя правыя апартуністы могуць сьцьвярджаць, што ў другой пяцігодцы «наступіць плаўны ход разьвіцьця». Падобныя сьцьвярджэньні зьяўляюцца, па сутнасьці, нічым іншым, як новым выданьнем «тэорыйкі» правага апартуізму аб «патуханьні клясавай барацьбы». Прапаведнікі правага апартуізму ў свой час актыўна выступілі супроць ленінскага тэзісу аб тым, што зьнічэньне клясаў пройдзе праз шлях абвостранай клясавай барацьбы пралетарыяту. Яны высунулі капітуляцкі антыленінскі контр-тэзіс аб зьнічэньні клясаў шляхам «затуханьня клясавай барацьбы і мірнага ўрастаньня кулака ў сацыялізм».

Партыя да канца выкрыла гэты кулацкі тэзіс і будзе непрымірыма выкрываць усякія спробы правых апартуністаў адкрыта ці замаскавана працягваць зноў свае збанкрутаваўшыя «тэорыі» аб «патуханьні клясавай барацьбы».

Правы апартунізм аллюстроўвае кулацкую небясьпеку і таму быў і застаецца **галоўнай небясьпекай.** Партыйныя масы, абмяркоўваючы выпікі XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі, з усёй сілай падкрэсьліваюць, што рашаючай зарукай выкананьня другой пяцігодкі зьяўляецца далейшая непрымірымая барацьба супроць посьбітаў правага апартунізму — галоўнай небясьпекі, супроць «левых» апартуністаў і прымірэнцаў, за пяўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

«Да бясклясавага грамадзтва рабочая клясa прыдзе толькі праз жорсткую клясавую барацьбу, на аснове далейшага ўмацаваньня пралетарскай дзяржавы, на аснове ўмацаваньня ленінскай бальшавіцкай партыі. Барацьба за ленінскую лінію, за чыстату прынцыпаў бальшавізму, супроць апартунізму і асабліва супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі, супроць «лесага» апартунізму і прымірэнцтва да іх — зьяўляецца неабходнай умовай выкананьня пляну найвялікшых работ другой пяцігодкі» (з рэзалюцыі Менскага партактыву па дакладу тав. Гікало аб выніках XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі)

Партыя на аснове ліста тав. Сталіна нанесла руйнуючы ўдар па кантрабандыстах з лягеру трацкісцкай контр-рэвалюцыі і гнілых лібералах, павысіла бальшавіцкую пільнасьць партыйных мас. Пытаньні марксыцка-ленінскай тэорыі, пытаньні гісторыі бальшавізму і надалей павінны стаяць у цэнтры ўвагі партарганізацый. Мы павінны сыстэматычна павышаць свой тэарэтычны ўзровень, глыбока вывучаць рэвалюцыйную тэорыю і практыку марксызму-ленінізму.

КП(б)Б, пад кіраўніцтвам ЦК, будзе і надалей з бальшавіцкай непрымірымасьцю змагацца супроць усякіх ухілаў у пацыянальным пытаньні і ў першую чаргу супроць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі.

Сходы партактыву Масквы, Ленінграду Менску і інш. яшчэ раз з нязьмернай сілай паказалі, што наша партыя, як ніколі, згуртавана вакол свайго Цэнтральнага Камітэту і правадыра партыі тав. Сталіна. Партыйныя масы, пралетарыят і калгаснае сялянства вялікай савецкай краіны аднадушна ўхваляючы пастановы XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі, заяўляюць аб сваёй поўнай гатоўнасьці змагацца за пераможную пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Мабілізаваць калгасныя масы на ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага

Павышэньне ўраджайнасьці—рашаючае зьвяно ў рабоце МТС

«Ва ўсёй рабоце па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, стварэньні калгаснага актыву і павышэньні ўраджайнасьці — гаворыцца ў пастанове ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага, — асабліва вялікая роля і адказнасьць **машына - трактарных станцый».**

Правыя апартуністы змазваюць ролю МТС, разглядваюць іх як простыя пракатныя пункты. Між тым, вопыт паказаў, што МТС зьяўляецца асноўным вагаром арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, лепшым арганізатарам калгаснай вытворчасьці. Пашырэньне сеткі МТС, ужываньне трактараў у масавым маштабе стварае магчымасьці для вытручваньня ўсёй дробна-ўласьніцкай псыхалёгіі калгасьніка — былога аднаасобніка.

У мінулым 1931 г. на калгасных палёх БССР працавалі 32 машына-трактарныя станцыі магутнасьцю ў 10.935 конскіх сіл. Поўнасьцю разьбіта «тэорыя» аб немагчымасьці ўжываньня трактараў ва ўмовах БССР. Трактар сябе цалкам апраўдаў. Калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, ідуць наперадзе па выкананьні ўсіх гаспадарча - палітычных кампаній, лепш спраўляюцца з сяўбой, уборкай і г. д.

Падрыхтоўка да трэцяй бальшавіцкай вясны, праблема павышэньня ўраджайнасьці ўскладае на МТС яшчэ большую адказнасьць.

Свячасова адрамантаваць трактарны парк, правільна скалучыць яго з опскай цягавай сілай, скласьці вытворча - фінансавыя пляны, дапамагчы калгасам стварыць пастаянныя вытворчыя брыгады, увесьці зьдзельшчыну, ліквідаваць абязьлічку, замацаваць за брыгадамі вучасткі, поўнасьцю ажыцьцявіць праграму агранарпрыемстваў — вось на што трэба зрабіць упор ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце МТС да сяўбы.

Вынікі работы МТС у 1932 г. перш за ўсё будуць расцэньвацца па якасьці сельска - гаспадарчай прадукцыі, што выпускаецца калгасамі, па ўзьняцьці ўраджайнасьці спэцыялізацыі, таварнасьці гаспадарак, свая часовым і поўным выкананьні перад дзяржавай сваіх абавязкаў.

Увядзеньне севазьваротаў, кэмізацыя глебы, селекцыя, аўчыстка і пратручаньне насеньня, радковы пасеў, дабраякаснае ворыва, барацьба са шкодніками палёў — у праграме весьнавой сяўбы, летніх пашывных работ павінны заняць рашаючае месца.

Да вясны па БССР трэба пабудаваць 29 новых МТС, а да канца 1932 году сетка МТС па Савецкай Беларусі будзе пашырана да 100. Зараз-жа распачаць падрыхтоўку да будаўнічага сэзону, упікнуць усіх летапіных памылак, зьніжць сабекошт будаўніцтва, выканаць пляновыя намячэньні. Усё гэта можна ажыцьцявіць на аснове поўнага выкананьня **6 умоў т. Сталіна.**

Сетка МТС, якая пашыраецца ў 3 разы, патрабуе значнай колькасьці кваліфікаваных кадраў, асабліва рулявых. Баявая задача кожнай МТС — загадзя арганізаваць курсы, падрыхтаваць адпаведную колькасьць трактарыстаў. Паляпшэньне матаральных умоў трактарыстаў, замацаваньне за імі машын, аказаньне штодзённай тэхнічнай дапамогі дасьць магчымасьць павысіць эфэктыўнасьць трактара, больш з'эканомім гаручага.

Божная партыйная арганізацыя павінна выканаць дырэктыву ЦК УсеКП(б) — «узмацніць штодзённую дапамогу машына-трактарным станцыям, у асаблівасьці ў справе ўмацаваньня кадраў», мабілізаваць усіх рабочых і тэхнічных пэрсанал на базвую падрыхтоўку да сяўбы.

У Барысаве са стварэньнем страхавых і насенных фондаў не сьпяшаюцца

БАРЫСАЎ 2.2. (БЕЛТА).

Па рэзалюцыі аб насенных фондах прахадзіць марудна. Плян выканан усяго на 65 проц. Па асобных-жа культурах паказальнікі куды горшыя. Насенны фонд тэхкультур осьпшан усяго на 41 проц., бульбы—44 проц., кармовых траў—49 проц.

Стварэньне страхавых фондаў па калгасах рабіў амаль правалена. Плян выкананы на 15 проц. Адказасобны-ж сэктар зусім не распачынаў гэтай працы. Раён мае паўнейшы правал у правядзеньні аўчысткі насеньня. Калгасамі аўчышчана 24 проц., а адказасобным сэктарам—толькі 6 проц. пляновага заданьня.

Калгасы Старасельшчыны па-баявому рыхтуюцца да весьнавой сяўбы

МСЬЦІСЛАЎЕ. (Наш спэцкор).

Калгасы Старасельшчыны першымі ідуць ў справе падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы. З 5 лютага сельсавет уключыўся ў гэнэральную праверку. Па правядзеньне рэйду мабілізавая увесь актыў, сэкцыі РСІ, селькоры, калгасьныя ўпаўнаважаныя—усяго каля 100 чалавек. Праверкай ахоплена 14 калгасаў і 1 саўгас. Рэйд пераварыўся ў масавую кампанію па мабілізацыі калгасных мас на падрыхтоўку да трацій бальшавіцкай сяўбы.

Старасельшчына ўжо мае рад посьпехаў. Плянам намечан прырост пасеўнай плошчы пад яравымі культурамі па ўсім сельсавеце на **33 проц.** Павялічэньне ідзе галоўным чынам за лік заворваньня аблогаў і скарачэньня плошчы пад папарам. Рэзка ўзрастае асноўная культура паляводзтва—лён. Калі ў 1931 г. пад ільном было занята **545** гэкт., дык у 1932 г.—**1.145** гэкт. (прырост на 110 проц.). У калгасе імя **Чарвякова** пад лён адводзіцца **497** гэкт. замест **200,** якія былі заняты ільном у мінулым годзе (прырост амаль на 150 проц.). Калгасы Старасельшчыны шпаркімі тэмпамі ідуць да спэцыялізацыі свайго паляводзтва, павышэньня таварнасьці гаспадарак.

Кулакі і іх агентура — апартуністы актыўна выступаюць супроць разьвіцьця тэхнічных культур, супроць спэцыялізацыі. Калгас **«Ржавец»** і **«Фастава»** пашыўшы пад кулакі ўпільу, скарацілі плян засеву тэхнічных культур на 50 проц. Мясцовая партыйная ячэйка, мабілізаваўшы калгасны актыў, панесла руйнуючы ўдар па кулацкай агітацыі. Пры дапамозе ўдарнікаў калгасы выцягнулі запушчаныя - памылкі, далажам зацьвердзілі кантрольныя лічбы засеву ільну.

Сьпіка насенных і страхавых фондаў па калгасах скончана. Ахоплівае-ца пакаторы недахват ільнасеня і вікі. Мабілізуюцца ўнутраныя рэсурсы. Калгас імя Чарвякова забясьпечвае ніцай усе калгасы сельсавету, распачаўшы памёк калгасамі абмен насеньня.

Па сельсавеце працуе 6 збожжаачышчальных абсокаў. Аўчыстка поўнасьцю будзе скончана 1 сакавіка. Ужо зараз плян выкананя на **60 проц.** Трэба адзначыць выпоўную нагрузку машын, якія працуюць ня больш 8 гадзін у суткі. Арганізацыя 2-х і 3-х зьменнай работы дала-б магчымасьць скончыць усю работу да 20 лютага. Перадавыя калгасы **«Чырвоны араты», імя Чарвякова, «1-га мая»,** стаўшы па гэты шлях, ужо скончылі работу па аўчыстцы насеньня. Вопыт перадавых неабходна перашесьці ў калгасы, якія адстаюць.

Бранзіваньня фуражныя фонды на час весьнавых работ створаны ва ўсіх калгасах.

Для рамонту інвэнтару 1 с.-г. машын арганізавана вялікая кустарная майстэрня пры калгасе імя Чарвякова. Рамонт распачаўся яшчэ 15 студзеня. Ужо адрамантавана **500** шт. інвэнтару. Зараз майстэрня пераключылася на рамонт баран і калёс. Рабочыя майстэрні ўзялі на сябе ў парадку сацспаборніцтва абавязак—скончыць увесь рамонт не пазьней 15 сакавіка.

Самаправерачныя брыгады ў часе рэйду мабілізуюць калгасныя масы на ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага **«аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў».** Калгасы прыступілі да арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад, распрацоўкі норм, абмяркоўваюць пляны расстаноўкі сіл у часе сяўбы.

Першым ідзе калгас імя Чарвякова, які ўжо **стварыў пастаянныя брыгады, прымацаваў да іх сродкі вытворчасьці, вызначыў ім адведныя палёвыя вучасткі, даўёў плян сяўбы да кожнай брыгады.** Па прыкладзе калгасу імя Чарвякова павінны ўзяцца за арганізацыю працы і іншыя калгасы.

Калгасы Старасельшчыны ідуць у авангардзе. Прыведзеныя факты гавораць аб тэй вялізарнай рабоце, якая ўжо прароблена да гэтага часу. Выпраўляючы нахалу пасобных памылкі, калгасы Старасельскага сельсавету ў поўнай гатоўнасьці, па-баявому сустрэнуць трацюю калгасную вясну.

Трэба толькі **больш** апрацыйнага кіраўніцтва з боку раённых арганізацый. Раённаму камітэту партыі—мабілізаваць актыў на свячасовае сказчаньне кампаніі па канчатковым разьмеркаваньні даходу, распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага **па ўсіх калгасах раёну.**

П. ЧЫКУН.

ПЕРШАЯ ДЭКАДА ЛЮТАГА НЕ ДАЛА ПЕРАЛОМУ

АСНОЎНЫЯ ЛЕСПРАМГАСЫ—БАБРУЙСКІ, АСІПАВІЦКІ І ГЛУСКІ ЎСЁ ЯШЧЭ ЦЯГНУЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ ЛЕСАВЫВАЗКІ

Толькі 50 проц. дэкаднага заданьня

Тэмпы лесавываз ўсё яшчэ невыстарчальныя. Ня глядзячы на добрую сяньную парогу, першая дэкада лютага належнага пералому не дала. Замест 1 млн. кбм. вывезена 568 тыс. кубамэтраў, або каля 50% дэкаднага пляну. Квартальнае заданьне на 10 лютага па вывазцы будматар'ялаў вы канана на 22,2 проц. (супроць 13,7 проц. на 1 лютага), па вывазцы дроў —на 25,9 проц. (супроць 19,5 проц.

Такім чынам, прырост зусім нязначны. Замест 11 проц. паводле пляну ў дэкаду па будматар'ялах мы маем 8,5 проц., па дровах—6,4 проц.

Пасобныя леспрамгасы замест павышэньня тэмпаў далі значнае зьніжэньне. Так, калі за апошнюю дэкаду ступеня Клімавіцкім леспрамгасам было вывезена 5.535 кбм., дык за першую дэкаду лютага — толькі 3.549 кбм. Слуцкі леспрамгас у апошній дэкадзе ступеня вывез 7.667 кбм., а ў першай дэкадзе лютага — 6.863 кбм. Такі-ж прыблізна малюнак мы маем па Чэрвеньскім, Парафіянскім і Чырвона-Слабодзкім леспрамгасах.

Асноўныя леспрамгасы, ад тэмпаў работы якіх у значнай ступені залежыць посьпех выкананьня квартальнага пляну, усё яшчэ цягнуцца ў хвасьце. Так, Бабруйскі леспрамгас на 10 лютага выканаў квартальнае заданьне па вывазцы будматар'ялаў на 14,3 проц., дроў — на 23,4 проц., Глускі леспрамгас вывез будматар'ялаў 20,4 проц. квартальнага пляну, дроў — 14,8 проц., Асіпавіцкі адпавядна 16 проц. і 21,1 проц.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што ўсякія апартуністычныя спробы апраўдаць слабыя тэмпы лесавываз у ступені прэзнай парогай ня маюць пад сабой ніякай падставы. Асноўнай прычынай невыкананьня пляну зьяўляецца ня дрэнная дарога, а ня ўменьне раду леспрамгасаў і пасобных раённых партыйных арганізацый пабальшавіцку змагацца за лес, за бесьперабойнае забесьпячэньне будаўніцтва і прамысловасьці лесаматар'ялам.

Адкрыты ліст калгасу «Ясная раніца» аб сустрэчных калгасных плянах па лесавывазцы ў большасьці раёнаў дагэтуль яшчэ не папулярызаваў сярод калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас. Матар'ялы, якія мы сёньня друкуем, сьведчаць аб тым, што ў Бабруйску і Гарадку па-ранейшаму пакладаюцца на апартуністычны самацёк у наборы возчыкаў, ня выконваюць пастановы Калгасцэнтру аб арганізацыі пастаянных калгасных абсокаў па лесавывазцы.

Да канца кварталу засталося 1½ месяца. За гэты час трэба ня толькі з посьпехам завяршыць выкананьне пляну першага кварталу, але і забясьпечыць ажыцьцяўленьне заданьня другога кварталу. Гэта патрабуе ад усіх партыйных, прафэсыянальных, савецкіх, калгасных і іншых арганізацый адстаючых раёнаў неадкладна зрабіць рашучы пералом у кіраўніцтве выканаў, разгарнуўшы шырокую масавую работу ваколо лесазагатовак.

Спробы кулацтва і яго агентуры-апартуністаў—сарваць лесазагатоўку і вывазку павінны сустрэць самы рашучы адпор.

Ударнай работай ў лесе—адказваем на заклік калгасу „Яснай раніцы"

МЫ КАЛГАСЬНІКІ КАЛГАСУ «МОЛАТ» (ЧЭРВЕНЬСКІ РАЁН) НА ФРОНЦЕ ЛЕСАЗАГАТОВАК ДАБІЛІСЯ ЗНАЧНЫХ ПОСЬПЕХАЎ.

ВОСЬ ВЫНІКІ НАШАЙ УДАРНАЙ РАБОТЫ: ПАВОДЛЕ ДАГАВОРУ З ІВАНАЯСКІМ ЛЕСАВУЧАСТКАМ МЫ ПАВІННЫ Ў ПЕРШЫМ КВАРТАЛЕ ЗАГАТОВІЦЬ 720 КБМ. ДРОЎ І БУДМАТАР'ЯЛАЎ. НА 1 ЛЮТАГА НАМІ ЎЖО ЗАГАТОЎЛЕНА 1.200 КБМ., АБО 166 ПРОЦ. НАШАГА ЗАДАНЬНЯ. ЗАРАЗ НАМІ ЗАКЛЮЧАН ДАГАВОР З ЛЕСАВУЧАСТКАМ НА ВЫВАЗКУ 1.250 КБМ. ДА КАНЦА СЭЗОНУ. **ЗА 10 ДЗЁН ЛЮТАГА НАМІ ЎЖО ВЫВЕЗЕНА 450 КМБ.**

ДЛЯ ПАСЬПЯХОВАЙ РАБОТЫ ПА ВЫВАЗЦЫ, ПА ПРЫКЛАДЗЕ КАЛГАСУ «ЯСНАЯ РАНІЦА», НАМІ ВЫЗНАЧАН **ПАСТАЯННЫ АБОЗ,** ЯКІ РАЗЬБІТЫ НА 4 БРЫГАДЫ ПА ЧАЛЕ З СТАРЭЙШЫМІ БРЫГАДЗІРАМІ ЗБРУЯ І КОНІ ЗАМАЦАВАНЫ ЗА КОЖНЫМ ЧЛЕНАМ БРЫГАДЫ.

МЫ НЯ СПЫНЯЕМ І ЛЕСАЗАГАТОВАК. ПА ЯКІХ НАМІ ВЫСУНУТ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН У КОЛЬКАСЬЦІ 200 КБМ. ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ГЭТАГА ПЛЯНУ НАМІ АРГАНІЗАВАНА БРЫГАДА ЛЕСАРУБАЎ У ЛІКУ 5 ЧАЛАВЕК, ЯКАЯ ШТОДЗЁННА ПРАЦУЕ Ў ЛЕСЕ.

АБВЯШЧАЮЧЫ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ ЛЕСАЗАГАТОЎЧАГА ФРОНТУ, МЫ ЗАКЛІКАЕМ ПАСЛЕДАВАЦЬ НАШАМУ ПРЫКЛАДУ КАЛГАСЫ **ХУТАРСКАГА** СЕЛЬСАВЕТУ «КАМУНАР», «ВАРАНОЎКА», «СЬЦЯГ КАСТРЫЧНІКА», «ЧЫРВОНАЯ ПАЛЯНА», «ЗМАГАР», «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ», «АКТЫВІСТ» І «ПАРТЫЗАН», А ТАКСАМА БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ—АДНААСОБНІКАЎ.

МЫ ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО СЬЛЕДУЮЧЫ НАШАМУ ПРЫКЛАДУ, КАЛГАСЬНІКІ І АДНААСОБНІКІ—БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ ХУТАРСКОГА СЕЛЬСАВЕТУ І ЎСЁЙ ЧЭРВЕНІЧЧЫНЫ АГУЛЬНЫМІ СІЛАМІ ДАБ'ЮЦЦА ПАСЬПЯХОВАГА ЗАВЯРШЭНЬНЯ ПЛЯНУ ЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ ЛЕСУ ЧАЦЬВЕРТАГА ЗАКОНЧНАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

ПА ДАРУЧЭНЬНІ АГУЛЬНАГА СХОДУ КАЛГАСЬНІКАЎ:
СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ **ХАРЫТАНОВІЧ.**
ЧЛЕНЫ ПРАЎЛЕНЬНЯ: **ЧЭРНАВЕЦ, ДЗЯНІСЕВІЧ.**
БРЫГАДЗІРЫ: **ХУРКЕВІЧ, КОУГАН.**

Вярбоўка лесарубаў і возчыкаў пастаўлена слаба

ГАРАДОК. (Наш спэцкор.).

Загатоўка і вывазка лесу па Гарадоцкім леспрамгасе ідзе вельмі марудна. Заданьне першага кварталу па загатоўцы будматар'ялаў на 1-га лютага выканана на 27 проц. Дроў на 35 проц., па вывазцы будматар'ялаў квартальнае заданьне выканана на 23 проц., дроў — на 33 проц. Недавыкананьне пляну тлумачыцца тым, што леспрамгас не гарантуўся яшчэ тварам да арганізаванага набору цягавай і рабочай сілы. Замест патрэбных па пляне 946 лесарубаў фактычна працуе толькі 213.

Райкалгасаюз і некаторыя сельскія саветы не дапамагаюць леспрамгасу ў правядзеньні дагаворнай кампаніі. З боку асобных калгасаў ёсьць выпадкі ўтрымліваньня вывазкі загатоўкі лесу. Так, калгас «Адраджэньне», Патапынскага сельсавету, і калгас імя Сталіна, Аляксандраўскага сельсавету, зусім адмовіліся заключыць дагавор з леспрамгасам.

Лесарубы і возчыкі большасьці участкаў яшчэ да гэтага часу не перавядзены на брыгадны метад работы. Няма штодзённага ўліку выпрацоўкі.

Прафарганізацыі і адміністрацыя леспрамгасу вельмі мала што зрабілі ў галіне разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж вучасткамі, брыгадамі і асобнымі лесарубамі. Леспрамгас ня мае пастаяннага ўліку ўдарнікаў лесараспрацовак. На 1932 год ня вызначан нават фонд для ўзнагароджаньня лепшых ударнікаў.

Зусім адсутнічае работа па махазацыі і рацыяналізацыі лесараспрацовак. Адпушчаныя ў 1931 г. сродкі ў суме 2.600 руб. на гэту справу не скарыстаны. Дрэнна наладжана рабочае снабжэньне.

М. В—ч.

Рашуча змагацца з кулацкай дзяльбой і асяданьнем ільну

У найкарацейшы тэрмін завяршыць ільназагатоўкі

ТАЛОЧЫН.

КАЛГАСЫ СЛАЎНАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, НА АСНОВЕ НЯЎХІЛЬНАГА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ЎКАЗАНЬНЯЎ ПАРТЫІ, ПРАВОДЗЯЧЫ НЕПРЫМІРЫМУЮ ВАРАНЬБУ З КУЛАЦКОМ І ЯГО АГЕНТУРАЙ, ВЫКАНАЛІ ПЛЯНЫ ІЛЬНАЗАГАТОВАК: ІМЯ БУДЗЁННАГА—105 ПРОЦ., «ІСКРА»—125 ПРОЦ., «З РАШАЮЧЫ» — 120 ПРОЦ., «УДАРНІК» — 110 ПРОЦ., «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ» — 108 ПРОЦ., «16 ПАРТЗЬЕЗД» — 103 ПРОЦ., «ФРУНЗЭ» — 100 ПРОЦ., «Х ЗЬЕЗД САВЕТАЎ» — 99,5 ПРОЦ. МЫ ДАЛІ ВАЛАКНО ВЫКЛОЧНА ВЫСОКАЙ ЯКАСЬЦІ, МЫ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЛІ І ПЛЯНЫ ПРОДАЖУ ДЗЯРЖАВЕ ЗВОЖЖА. ГЭТЫЯ ПОСЬПЕХІ НАШЫХ КАЛГАСАЎ ЗАВЯСЬНЕЧАНЫ МЭТАДАМІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА, ПРАВІЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ РАБОТЫ ПА ПЕРААПРАЦОЎЦЫ ВАЛАКНА.

МЫ, КАЛГАСЬНІКІ СЛАЎНАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, АБГАВАРЫЎШЫ ЛІСТ УДАРНІКАЎ «ДЗЬВІНІ» РАШУЧА АСУДЖАЕМ ДЗЕЙНАСЬЦЬ ПРАЎЛЕНЬНЯЎ КАЛГАСАЎ «ЧЫРВОНЫ БАЦЬ», «КАМІНТЭРН», «НОВАЕ ЖЫЦЦЁ», «САВЕТ» (БАБРУЙСКАГА РАЁНУ), ЯКІЯ ПА-КУЛАЦКУ РАЗЬМЕРКАВАЛІ ЛЁН, НІЧОГА НЯ ЗДАЎШЫ ДЗЯРЖАВЕ.

МЫ ЛІЧЫМ ТАКСАМА НЕДАПУШЧАЛЬНЫМ АДСТАВАНЬНЕ ПЛОСКАГА, ПАЗЛАЎСКАГА І ВАЛОСАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТАЎ НАШАГА РАЁНУ, ЯКІЯ ПАНЕБНА МАРУДЗЯЦЬ З АПРАЦОЎКАЙ ІЛЬНУ.

МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ ВЕСЬЦІ БАРАЦЬБУ ЗА ДАЛЕЙШАЕ ПАВЫШЭНЬНЕ ТЭМПАЎ ЗАГАТОВАК І ПАЛЯПШЭНЬНЕ ЯКАСЬЦІ АПРАЦОЎКІ Ў ІНШЫХ САВЕТАХ ТАЛАЧЫНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ. МЫ БЯРЭМ НА БУКСІР АДСТАЮЧЫЯ КАЛГАСЫ «НОВЫ БЫТ», СЛАВЕНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, «КРАСІНА», МАРКЛЕЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, НОВАПАЛЕСКІ СЕЛЬСАВЕТ І ВЫСЫЛАЕМ ТУДЫ БРЫГАДУ З ЛЕПШЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ, ПРЭМІЯВАНЫХ УДАРНІКАЎ.

МЫ ВЫКЛІКАЕМ УСЕ КАЛГАСЫ ТАЛАЧЫНСКАГА РАЁНУ І АДНААСОБНІКАЎ — БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ ПА НАШЫМ ПРЫКЛАДЗЕ ЗАВЯРШЫЦЬ ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ І ГЭТЫМ У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ВЫВЕСЬЦІ НАШ РАЁН З АДСТАЮЧАГА Ў ПЕРАДАВЫЯ.

Па даруч

Народна-гаспадарчы плян 1932 году і задачы ЦКК-РСІ

РЭЗАЛЮЦЫЯ IV ПЛЕНУМУ ЦКК УсеКП(б) АД 10 ЛЮТАГА 1932 ГОДУ

ПА ДАКЛАДУ тав. Я. Э. РУДЗУТАКА

1. Партыя дасягнула вялізарных посьпехаў у выкананьні народна-гаспадарчага пляну 1931 году, рашаючага году пяцігодкі. Партыя пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК вырашыла задачу сусьветна-гістарычнага значэньня пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі і тым самым канчаткова вырашыла ленінскае пытаньне «хто каго» ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы на карысьць сацыялізму.

Выкананьне пляну 1932 г. завершыць пяцігадовы план, створыць моцную індустрыяльную базу для завяршэньня сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, вызваліць краіну па асноўных галінах ад замежнай залежнасьці, забясьпечыць далейшыя посьпехі калгаснага буд'ўніцтва і завяршэньне ў асноўным калектывізацыі ў 1932-33 г. г.

Выкананьне народна-гаспадарчага пляну 1932 г. падводзіць шчыльна нас да вялікіх задач другой пяцігодкі, вызначаных XVII партканфэрэнцыяй, як «канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне прычын, якія параджаюць клясавую розьніцу і эксплёатацыю і перамаганьне пережыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

2. Рашаючай умовай выкананьня пляну 1932 г. зьяўляецца павышэньне прадукцыйнасьці працы.

«Прадукцыйнасьць працы гэта ў апошнім разрахунку самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу. Капіталізм стварыў прадукцыйнасьць працы небывалую пры прыгонніцтве. Капіталізм можа быць канчаткова пераможаны і будзе канчаткова пераможан тым, што сацыялізм створыць новую, значна больш высокую прадукцыйнасьць працы. Гэта справа вельмі цяжкая і вельмі доўгая, але яна пачата. Вось у чым самае галоўнае» (Ленін). Мы ў сучасны момант ужо маем па асобных галінах і прадпрыемствах такую тэхніку, якая пры дыктатуры пралетарыяту робіць магчымымі дасягненьні гэтай новай, значна больш высокай прадукцыйнасьці працы, што на практыцы даказана на радзе прадпрыемстваў і будоўляў, якія пакідаюць взаду нават амэрыканскі ўзровень прадукцыйнасьці. Шэсьць умоў тав. Сталіна зьяўляюцца рашаючымі ў стварэньні новай сацыялістычнай прадукцыйнасьці працы. Барацьба за ажыцьцяўленьне гэтых умоў у 1932 г. павінна быць у цэнтры работы гаспадарчых, прафэсыянальных, партыйных, камсамольскіх і іншых арганізацый; у яе павінны быць уцягнуты шырокія масы рабочых. У 1932 г. мы павінны дабіцца сапраўднага ажыцьцяўленьня гэтых умоў на кожным заводзе, у цэху, саўгасе, у кожнай брыгадзе, на кожным варштаце і агрэгаце. Яны павінны быць практычна замацаваны бальшавіцкім правядзеньнем у жыцьцё пастаноў ЦК і СНК аб перабудове сыстэмы зарплаты, аб разбуйненьні раду савецкіх прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый, аб укараненьні гаспадарчага разрахунку, аб паляпшэньні абслугоўваньня матар'яльных і культурна-бытавых запатрабаваньняў рабочых мас, аб паляпшэньні быту інжынэрна-тэхнічных работнікаў, аб разьвіцьці савецкага гандлю і інш.

3. Ажыцьцяўленьне гэтых грандыёзных задач патрабуе, каб у аснову ўсёй сваёй работы органы КК-РСІ паклалі кантроль за правядзеньнем у жыцьцё і праверку выкананьня дырэктыў і важнейшых практычных мерапрыемстваў партыі і ўраду. Уліч вачы адзначаныя як XVII партыйная канфэрэнцыя, так і пастановы ЦК УсеКП(б) недахопы ў гаспадарчай рабоце, органы КК-РСІ павінны паставіць у цэнтры сваёй увагі перабудову работы і кіраўніцтва па-новаму, аўладаньне тэхнікай, правядзеньне сапраўднага гаспадарчага разрахунку і рэжыму эканоміі, мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў, зьніжэньне сабекошту і павышэньне якасьці прадукцыі, павышэньне якасных паказальнікаў сельскай гаспадаркі, правільную арганізацыю працы і прывядзеньне ліку занятых рабочых у адпаведнасьць з сапраўдным патрабаваньнем у рабсіле, арганізаваны набор рабочай сілы і мэханізацыю працы, ліквідацыю ўраўнілаўкі і абезьлічкі, паляпшэньне матар'яльна-бытавога становішча рабочых, стварэньне сваёй вытворча-тэхнічнай інтэлігэнцыі і кадраты аб вышэйшарна-тэхнічных кадрах, усяляпнае падтрыманьне рабочага выдвіжэнства і рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

Асаблівая ўвага органаў КК-РСІ павінна быць зьвернута на правільнае зэканомленьне тэхнікі буйнейшых прадпрыемстваў, якія пакуль пускаюцца, на іх падрыхтоўку да пуску, на правільную падрыхтоўку і расстаноўку рабочых і тэхнічнага персаналу, на стварэньне матар'яльнай і культурнай базы для рабочых. Выкананьне вялізарнай будаўнічай праграмы 1932 году патрабуе самага шырокага ўкараненьня новай буд'ўнічай тэхнікі, якая паскарае і патанне буд'ўніцтва, эканомлае расходаваньня матар'ялаў, самага шырокага разгортваньня іх вырабу і прыстасаваньня новых відаў мясцовых буд'ўнічых матар'ялаў.

Стрыжнявымі пытаньнямі, на якіх павінна быць сканцэнтравана асноўная ўвага ЦКК-НК РСІ, зьяўляецца мэталюргія, вугаль, машынабуд'ўніцтва, хэмія, транспарт.

Органы КК-РСІ павінны штодзённа правяраць канкрэтнае выкананьне шасьці ўмоў тав. Сталіна ў кожнай данай галіне, у кожнай данай рабоце. Органы КК-РСІ павінны сачыць за давядзеньнем вытворчых плянаў да кожнага прадпрыемства, цэху і брыгады, за зьнішчэньнем усіх перашкод да ўдзелу мас рабочых у распрацоўцы гэтых заданьняў і да высоўваньня імі сустрэчных плянаў, за шырокім разгортваньнем сацыялістычных форм працы — сацыяборніцтва і ўдарніцтва. Органы КК-РСІ павінны на кожным прадпрыемстве актыўна змагацца за ажыцьцяўленьне лёзунгу XVII партыйнай канфэрэнцыі: «Пры даных матар'яльных сродках, на аснове большай эканоміі, лепшага скарыстаньня вытворчых магчымасьцяй лепшай мабілізацыі сіл і лепшага практычнага кіраўніцтва даць краіне больш прадукцыі і лепшай якасьці».

4. Для выкананьня пастаўленых задач асабліва значэньне набывае выразная работа ўсіх зьвеньняў дзяржапарату. У сувязі з гэтым неабходна ўзмацніць барацьбу з правяленьнямі бюракратызму і буржуазных тэндэнцый у апараце, прыстасаваць дзяржапарат да новых умоў арганізацыі гаспадаркі і кіраўніцтва.

Максымальная канкрэтнасьць і апэрацыйнасьць кіраўніцтва павінна быць пакладзена ў аснову барацьбы за паляпшэньне работы савецкага і гаспадарчага апарату. У гэтых мэтах неабходна разгарнуць шырокае прыцягненьне рабочых і калгасьнікаў да кіраўніцтва дзяржавай. Намечаныя пастановай ЦК і ЦКК ад 15 сакавіка 1930 году формы вылучэньня рабочых у савецкі апарат і арганізацыя масавага рабочага кантролю і шэфства заводаў, пад кіраўніцтвам ЦКК-НК РСІ, атрымалі сваё разьвіцьцё за апошні год (сацсумяшчэньне, групы сабекошту, шэфства, чыстка апаратаў, лёгкая кавалерыя, рэйды і г. д.).

Гэтыя масавыя формы органам КК-РСІ неабходна непарыўна шырэй разгарнуць у 1932 годзе, адначасова рашуча ліквідаючы ўсякі фармалізм і паравнасьць у правядзеньні паказаных работы. РСІ са свайго боку павінны забясьпечыць нармальную работу рабочых і калгасьнікаў, якія прыцягваюцца, зьнішчаць усякія спробы бюракратычных адгаворак і ахіленьня асобных рабочых калектываў ад удзелу ў кантролі і рабоце дзяржапарату.

Органы КК-РСІ ў адпаведнасьці з новымі задачамі павінны перабудаваць сваю работу, дабіваючыся большай выразнасьці, якасьнага палепшэньня ня ўсяго апарату, асабліва пізавога, стваральны вакол РСІ сапраўдны актыў з рабочых, ударнікаў і спэцыялістаў-грамадзкіх працаўнікоў, перадавых калгасьнікаў і калгасьніц, выкарыстоўваючы шырока кадры камсамолу. Уся сыстэма КК-РСІ павінна быць мабілізавана вакол стрыжнявых задач гаспадарчага пляну. Павінна быць устаноўлена сапраўдная сувязь і ўзаемная інфармацыя цэнтру і месц. ЦКК-РСІ будзе расцэньваць работу сваіх мясцовых арганізацый у залежнасьці ад якасных і колькасных рэзультатаў работы на мясцох.

Арганізацыі КК-РСІ ў сваёй рабоце павінны кіравацца ўказаньнем Леніна: «Ня толькі і нават ня столькі «лавіць», «выкрываць» (гэта задача суда, з якім РСІ сутыкаецца блізка, але зусім не «тождественна») — колькі ўмець паправіць». Цэнтральныя і мясцовыя органы КК-РСІ павінны вастойліва даводзіць да канца кожную пачатую справу, выяўляючы ў выдатку дрэнная работы сапраўды вінаватых асоб і паказваючы адпачасова станоўчыя прыклады работы.

6. Крызіс капіталістычнай гаспадаркі, які паглыбляецца, узрастаючы варожасьць капіталістычных клясаў да СССР, які пераможна будуе сацыялізм, абвостраная клясавая барацьба ўнутры краіны, якая ня спыняецца (супраціўленьне аджываючых клясаў, буржуазны ўплыў на паасобныя пласты і групы працоўных, чужыя клясавыя ўплывы ў апараце), патрабуюць выключнай рэвалюцыйнай пільнасьці з боку органаў КК-РСІ.

У гэтай палітычнай абстаноўцы органы КК-РСІ павінны па-ранейшаму весьці непрымірымую барацьбу з галоўнай небясьпекай на даным этапе — правым ухілам, ні на мінуту не аслабляць барацьбы з «левымі» загібамі, з рэшткамі трацкізму, з трацкісцкай кантрабандай і гнілым лібералізмам, шырока разгарнуць работу па ленінскім выхаваньні ўзросшых партыйных радоў, па насаджэньні жалезнай партыйнай дысцыпліны, па ўмацаваньні ленінскага адзінства партыі.

Падрыхтоўка прапагандыстаў—неабходная ўмова для паляпшэньня якасьці заняткаў

Лепельская партарганізацыя правяла вялікую работу па камплектаваньні сеткі партыйнай асьветы, па растлумачэньні задач павышэньня марксыцка-ленінскага ўзроўню партыйных мас. Гэта работа дала свае станоўчыя рэзультаты. У раёне арганізаваны 32 першапачатковыя школы, тры ВСПШ і вячэрні Камвуз. Партвучобай ахоплена большая палова складу арганізацыі і амаль поўнасьцю кандыдаты.

Для кіраўніцтва такой сеткай партасьветы патрабавалася вялікая колькасьць прапагандыстаў. Вылучаныя прапагандысты ў сваёй большасьці ня маюць належнай тэарытычнай падрыхтоўкі. З 34 прапагандыстаў 26 таварышоў маюць падрыхтоўку толькі пачатковай партшколы.

У мэтах павышэньня падрыхтоўкі прапагандыстаў райком партыі пры непасрэднай дапамозе прапгрупы ЦК арганізаваў прапсэмінары. Заняткі сэмінара праводзяцца рэгулярна адзін раз у месяц на працягу двух дзён. Прапрацаваны наступныя пытаньні: 1) дзьве сыстэмы, 2) індустрыялізацыя СССР, 3) рэканструкцыя сельскай гаспаладаркі, 4) разьмеркаваньне даходу ў калгасах, 5) задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, 6) пытаньні савенкага гандлю, 7) плянавая гаспадарка ў СССР, 8) сучасны этап сацыялістычнага буд'ўніцтва, 9) партыя — авангард рабочай клясы, 10) барацьба партыі на два фронты і 11) ліст тав. Сталіна ў часопіс «Пролетарская революция». Побач з гэтым прапрацавана пытаньне аб мэтодыцы выкладаньня ў сетцы партасьветы.

Не адмаўляючы раду недахопаў у рабоце сэмінара, траба адзначыць, што гэта мерапрыемства цалкам сябе апраўдала, яно забясьпечыла значнае паляпшэньне якасьці заняткаў у нізавой сетцы партасьветы. Глыбокая прапрацоўка ў сэмінары тэарытычных пытаньняў узброівае прапагандыстаў, палягчае іх самаадпрыхтоўку да заняткаў. Як правіла, значна лепш, больш ажыўлена праходзяць заняткі ў тых школах партасьветы, з якіх прапагандысты рэгулярна наведваюць сэмінары. Такія школы сапраўды зьяўляюцца актыўнымі дапаможнікамі парт'ячэек у выкананьні чарговых задач партыі на вёсцы.

Неабходна ў далейшым дабіцца поўнага наведваньня заняткаў сэмінара прапагандыстамі, а таксама адвесьці поўнае месца ў праграме сэмінара пытаньню аўладаньня тэхнікай для таго, каб кожны прапагандыст сапраўды зьяўляўся перадавіком ва ўсіх галінах работы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Ф.

Партыйнае будаўніцтва

МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАЕ ВЫХАВАНЬНЕ ПАРТЫЙНЫХ МАС—

важнейшая зброя ў барацьбе за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва

ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСІ АДНАДУШНА ЎХВАЛЯЮЦЬ ПАСТАНОВЫ XVII ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ І XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

Партвучобу—на вышыню сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя падагуліла вынікі пройдзенага этапу бальшавіцкага змаганьня за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за ажыцьцяўленьне грандыёзнага пляну першай пяцігодкі.

Пройдзены этап характарызуецца гігантскімі перамогамі сацыялізму на ўсіх франтох, завяршэньнем пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі Савецкага Саюзу. «Важнейшым вынікам сацыялістычнага буд'ўніцтва першай пяцігодкі зьяўляецца канчатковы падрыў карэньняў капіталізму ў вёсцы, які правырашае поўную ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў і поўнае зьнішчэньне клясаў» (з паст. XVII партканфэрэнцыі).

Набытыя партыяй посьпехі ў змаганьні за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі абумовілі ажыцьцяўленьне ў другім пяцігодзьдзі таго, што яшчэ ў пяцігодкі час многім здавалася далёкім будучым. У прынятых партканфэрэнцыяй дырэктывах да складаньня другога пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі СССР пастаўлена задача сусьветна-гістарычнага значэньня — задача пабудовы ў другой пяцігодцы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Гэтыя пастановы прыкавалі да сябе ўвагу ўсёй нашай партыі, усёй рабочай клясы і працоўных мас, яны выклікалі новы магутны ўздым творчай актыўнасьці і энтузіязму мас на далейшую ўпартую барацьбу за ўмацаваньне пралетарскай бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету — СССР.

Гэтыя новыя складаныя задачы барацьбы за канчатковую перамогу сацыялізму патрабуюць яшчэ большага паляпшэньня якасьці работы ўсіх зьвеньняў партарганізацыі, канкрэтнасьці і апэрацыйнасьці ў кіраўніцтве, узмацненьня выхаваўчай работы сярод рабочых мас і калгаснага сялянства. Гатыя задачы патрабуюць у першую чаргу ўзмоцненага разгортваньня работы па марксыцка-ленінскім выхаваньні партыйных мас. «Неабходна ўзброіць кожнага камуніста разуменьнем асаблівасьцяй і задач сучаснага этапу барацьбы — за сацыялізм, для ўзначаленьня мас, для пасьпяховага кіраўніцтва імі ў барацьбе за хутчэйшую ліквідацыю нашай тэхніка-эканамічнай адсталасьці» (Постышаў).

Вось гэтай важнейшай задачы недазваньваюць яшчэ нашы паасобныя раённыя партарганізацыі. Матар'ялы, якія сёньня зьмяшчаюцца, сьвядчаць аб надзвычай дрэнным пастаноўцы справы партыйнай асьветы. Многія партшколы ў Капыльскім, Пухавіцкім, Брагінскім і Асьвейскім раёнах зусім не распачыналі яшчэ заняткаў. У радзе выпадкаў запатлы прахадзіць дрэнна, бяз глыбокай прапрацоўкі тэмы, пры адсутнасьці поўнай мэтодыкі. Абязьлічваюць школ у адносінах прапагандыстаў, урэгулёўскі падыход да розных груп мае да волі значнае пашырэньне. Некаторыя мясцовыя партарганізацыі не надаюць належнай увагі павышэньню тэарытычнай падрыхтоўкі прапагандыстаў. А, зрэшты, зрозумела-ж, што ў вялікай ступені якасьць, ідэалёгічны зьмест заняткаў залежаць ад таго, наколькі ўзброены марксыцка-ленінскай тэорыяй самі прапагандысты, выкладчыкі.

Буйнейшая памылка дапушчана кіраўніцтвам парткалектыву заводу «Камунар» у арганізацыі партвучобы. Там проста пераняслі не стварэньне сеткі партасьветы, а запавольнцца толькі работай тэхнікуму. У рэзультаце праграма партвучобы сьцісьнута, час для выкладаньня грамадзкіх дысцыплін адведзен нязначны, наогул вучоба па марксыцка-ленінскім выхаваньні падменена тэхнічнай вучобай.

Зразумела, што тэхнікум заводу «Камунар» — вялізарнейшае дасягненьне, важнейшы фактар ажыцьцяўленьня лёзунгу аб аўладаньні тэхнікай, але падмяняць адно другім нельга.

Наколькі недаацэньваецца партвучоба і, галоўным чынам, выхаваньне новага пакаўленьня кіраўніцтвам заводу «Камунар», відаць яшчэ і з таго, што там большая палова кандыдатаў не ахоплена ніякімі відамі вучобы.

Паданыя факты зусім пераканальна паказваюць, што партасьветы не зьяўляюцца ўласьцівымі толькі паказаным арганізацыям, яны значна больш распіраны. Таму простым абавязкам, неадкладнай задачай партарганізацый — зьяўляецца па-бальшавіцку ўзяцца за наладжаньне справы марксыцка-ленінскага выхаваньня камуністаў і камсамольцаў, за ўзмоцненае разгортваньне выхаваўчай работы сярод рабочых і калгасных мас.

Зараз асноўным у рабоце ўсёй сеткі партасьветы павінна быць самая глыбокая прапрацоўка пастаноў XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі, самая шырокая папулярызацыя гэтых пастаноў сярод беспартыйных мас, поўнае апалучэньне навучальнай работы партсеткі з практычным ажыцьцяўленьнем задач, вызначаных XIV зьездам КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыяй.

Паляпшэньнем якасьці работы сеткі партасьветы яшчэ ў большай мерэ ўзброім партыйныя масы, павысім клясавую пільнасьць у далейшай барацьбе супроць правага апартунізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «лявацкага» пражэрэрства і заскокаў, супроць гнілога добранізму да праяўленьняў контрэвалюцыйнай трацкісцкай кантрабанды.

Усе сілы на выкананьне пастаноў XIV зьезду КП(б)Б і 17 партканфэрэнцыі

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу). 12 лютага адбыўся сход гарадзкога партыйнага актыву. З дакладам аб вынніках XVII партканфэрэнцыі выступіў тав. Гападзеў. Оход партактыву цалкам ухваліў пастановы канфэрэнцыі і заклікае гарадзкую партарганізацыю мабілізаваць усе свае сілы на пасьпяховае практычнае ажыцьцяўленьне гэтых пастаноў.

***

БАРЫСАЎ. (Па тэлеф.). На ўсіх прадпрыемствах Барысаўшчыны шырока разгорнута работа па прапрацоўцы пастаноў XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі.

Барысаўская партарганізацыя адпачутна ўхваліла пастановы зьезду КП(б)Б і ўсесаюзнай партканфэрэнцыі і адказвае ўзмацненьнем работы па выкананьні праграмы 4-га, заключнага году, па падрыхтоўцы да ўступленьня ў другую пяцігодку.

МАГІЛЕЎ. Прапрацоўка пастаноў XIV зьезду КП(б)Б, XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі на гарбарні імя Сталіна адбываецца побач з жамчэньнем рацыі канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на пасьпяховае выкананьне вытворчай праграмы 4-га, заключнага году пяцігодкі.

У мэтах ажыцьцяўленьня лёзунгу — аўладаць тэхнікай — праводзіцца ў жыцьцё тэхнічны мінімум. У цэхах арганізуюцца гурткі па вывучэньні вытворчых працэсаў. Шматтыражка «Сталінец» выпусьціла тэхнічную старонку.

З заводу пасланы ў падшэфны сельсавет брыгада для папулярызацыі сярод калгасных і бяднацка-серадняцкіх адзіласобных мас пастаноў XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі, для мабілізацыі іх на баявую падрыхтоўку да правядзеньня 3 бальшавіцкай весны.

Нагнаць прапушчанае

Капыльская раённая партарганізацыя правяла значную работу па камплектаваньні сеткі партасьветы. Усіх відамі вучобы ахоплена было ў пачатку навучальнага году 74,9 проц. членаў партыі, 99 проц. кандыдатаў. Дрэнна тое, што, прачэўшы камплектаваньне сеткі партасьветы, кіраўніцтва Капыльскай партарганізацыі ня цікавілася ходам заняткаў у школах, не ўжывала ніякіх захадаў для павышэньня тэарытычнага ўзроўню прапагандысцкага складу. Наогул справа партыйнай вучобы была пралетаўлена самацёку. У рэзультаце гэтага паказаныя лічбы ахопу вучобай камуністаў аказаліся проста лічбамі. Некаторыя школы (Чыжэвічы, Слабада-Кучынская, Цімкавічы і інш.) нават не пачалі ні аднаго разу заняткаў. У радзе іншых школ часта зрываюцца заняткі, наглядаецца адсу слухачоў.

Такое зьявішча недапушчальна. Райком партыі павінен сурёзна заняцца справай пастаноўкі на належную вышыню марксыцка-ленінскага выхаваньня партыйных мас. А.

А. ХАЦКЕВІЧ

Выкананьне фінпляну 1932 г.—неадлучная частка барацьбы за другую пяцігодку

Для БССР, як і для ўсяго Савецкага Саюзу, 1931 год быў годам напружанай і пераможнай барацьбы за ажыцьцяўленьне рашаючых задач першай пяцігодкі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. На фінансава-крэдытную сыстэму ў гэтай барацьбе было ўскладзена адно з адказнейшых і гаворовых заданьняў: «мабілізаваць максымум сродкаў на справу фінансаваньня нашай індустрыі, на справу фінансаваньня нашых саўгасаў і калгасаў» (Сталін). Для паскарэньня тэмпаў сацыялістычнага буд'ўніцтва неабходна было пашырыць крыніцы сацыялістычнага накапленьня; знайсьці і рацыянальна скарыстаць гэтыя крыніцы — такая была задача фінансава-крэдытных органаў.

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя дала выразныя высноўны аб узмацненьні фінансавай работы, аб узмацненым накапленьні ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

«Разгортваньне тавараабароту, перш за ўсё, раздробнага і правядзеньне прынцыпу гаспадарчага разрахунку ва ўсёй гаспадарчай рабоце зьяўляецца важнейшым стымулам для выяўленьня вялізарных, усё яшчэ ня выкарыстаных унутраных рэсурсаў, якія ёсьць у нашай гаспадарцы і якія спрыяюць паскарэньню росту сацыялістычнага накапленьня» — падкрэслена ў рэзалюцыі XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі па дакладах т.т. Молатава і Куйбышава. Канфэрэнцыя адзначыла антыбальшавіцкі характар «левых» фраз аб пераходзе да «прадуктаабмену» і аб «адміральні грошай» ужо на даным стадыі буд'ўніцтва сацыялізму.

Пад кіраўніцтвам нашай партыі, пры актыўным удзеле рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных, дзякуючы рашучай барацьбе з правааппартуністычным самацёкам у фінансавай рабоце, з «лявацкай» недаацэнкай ролі і значэньня фінансавай сыстэмы на даным этапе, мы выканалі ў асноўным заданьні мінулага году, а па асобных вучастках дабіліся сапраўды бальшавіцкіх перамог: перавыканан план мабілізацыі сродкаў насельніцтвам, з посьпехам рэалізаваны касавыя дзяржаўныя пазыкі, перавыкананы план бюджэтнага фінансаваньня народнай гаспадаркі і асабліва прамысловасьці.

Мабілізацыя сродкаў насельніцтва БССР па патрэбы сацыялістычнага буд'ўніцтва дала ў 1931 годзе 173.600 тыс. руб., або 106,9 проц. заданьня (бяз мэтавых узносаў калгас-сыстэмы). Заданьне па абавязковых плацяжох выканана на 103 проц., па добраахвотных—на 111,5 проц.

Такіх вялізарных посьпехаў у мабілізацыі сродкаў насельніцтва, асабліва па добраахвотных плацяжох, упалося лішняга на аснове пасьпяховага ажыцьцяўленьня вялізарнага пляну сацыялістычнага буд'ўніцтва, на аснове поўнага і шпаркага росту матар'яльнага дабрабыту працоўных мас, у выніку разгорнутай масавай грамадзка-палітычнай работы вакол фінансавай праграмы трацяга, рашаючага.

Разам з гэтым неабходна падкрэсьліць, што фінансава-крэдытная сыстэма БССР з пачатку мінулага году ня ператварыла работу па мабілізацыі сродкаў у найшырэйшую масава-палітычную кампанію, насычаную сацыялістычнымі формамі працы — сацыяборніцтвам, ударніцтвам і грамадзкім буксірам, ня зрабіла ўцягнуць у гэту кампанію рабочых, калгасьнікаў і бяднацка-серадняцкіх мас.

Толькі ў другой палове мінулага году, асабліва ў чацьвертым квартале, быў дасягнут рашучы пералом у выкананьні фінпляну шляхом ліквідацыі кампанейшчыны і шырокага скарыстаньня выпробаваных сацыялістычных форм работы. Калі-б мы дабіліся гэтага пералому з пачатку мінулага году, дык ня прыйшлося-б зараз адпачаць адставаньне па радзе раёнаў і вучастках работы: значныя недоімкі па с.-г. падатку, самаабкладаньні і страхоўцы, у тым ліку недоімкі з мугацкіх гаспадарак, асабліва па Гарадоцкім, Расьцюковіцкім, Расоўскім і Чырвонапольскім раёнах. Калі-б мы дабіліся гэтага пералому раней, мы ня мелі-б адставаньня ў некаторых раёнах па чарговых узносах рэалізаванай пазыкі «Трэці рашаючы», ня мелі-б недавыкананьня пляну ўкладаў у ашчадкасы і паляпшэньня па спажыўсыстэме.

Дзяржбюджэт БССР на 1931 год быў разьлічан на ажыцьцяўленьне вялізарных колькасных і якасных паказальнікаў па аграмадзкапай гаспадарцы, вызначаных народна-гаспадарчым і фінансавым планам. Досыць адзначыць, што вынікі работы прамысловасьці ў 1931 г. значна лепшыя, чым у 1930 годзе, аднак, па радзе важнейшых якасных і колькасных паказальнікаў пляновага намечаны непавыкананы. Зразумела, гэта адмоўна адбілася на выкананьні даходнай часткі дзяржбюджэту, што ў сваю чаргу вылікала скарачэньне расходнай часткі.

Тым больш увагі заслугоўвае той факт, што, ня гледзячы на некаторы непагадар пастуленьняў у бюджэт з аграмадзкапай гаспадаркі, мы цалкам выканалі план яе фінансаваньня па дзяржбюджэце, выдаткаваўшы на гэту мэту 53.400 тыс. руб., або 100,3 проц. ацэнаньня, у тым ліку 24 млн. р., або 106,1 проц. па прамысловасьці.

Вынікі ажыцьцяўленьня дзяржбюджэту ў мінулым годзе паказваюць на слабую бюджэтна-фінансавую дысцыпліну рату гаспадарчых арганізацый, невыстарчальную барацьбу з парушэньнямі фінансавай дысцыпліны з боку фінансава-крэдытных органаў.

Разам з гэтым практыка мінулага году выявіла простую залежнасьць даходнай часткі бюджэту ад выкананьня ўсяго народна-гаспадарчага пляну, паказала вялізарнае значэньне барацьбы фінансава-крэдытнай сыстэмы, праз кантроль рублём, за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку, за зьніжэньне сабекошту, рацыяналізацыю вытворчасьці і мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў у прамысловасьці і ўсёй народнай гаспадарцы. Надзейнай зброяй у барацьбе за ўкараненьне самага суровага гаспадарчага разрахунку зьявілася крэдытная рэформа, якая ўстанавіла мэтавасьць, тэрміновасьць і аваротнасьць банкаўскага крэдыту і пасьпяліла гаспадарчыя органы ўласнымі аваротнымі сродкамі. У выніку крэдытнай рэформы мы маем некаторае павышэньне мапэўрадольнасьці гаспадарчых органаў, паскарэньне звароту капіталу, павялічэньне мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Аднак, гэтыя пасягненьні зусім малыя. Фінансава-крэдытная сыстэма яшчэ далёка не аўладала мэханізмам гаспадарча-разрахункового кіраўніцтва і кантролю за правільным скарыстаньнем матэрыяльных крэдытаў. Есьць шмат выпадкаў парушэньня закону аб крэдытаваньні (Лоеўскі, прамсакапрацы), атрыманьня пазычак пад праданы тавар (Белгалдаль), або продажу непрадаважнай прадукцыі. Пратэрмінаваньня банкаўскіх крэдытаў складалі на 1 студзеня 1932 году звыш 1 мільёна рублёў. Плянаваньне вытворчага крэдытаваньня калгасаў праведзена неадпавальняюча; у выніку крэдыты скарыстаны толькі на 20 млн. руб., або на 50 проц. ліміту.

Гэтыя недахопы ў практыцы крэдытнай рэформы адбіліся на выкананьні колькасных і якасных паказальнікаў па аграмадзкапай гаспадарцы.

Важнейшай асновай нашай фінансавай гаспадаркі, надзейным вагаром фінансавай палітыкі зьяўляецца разгортваньне тавараабароту. Кааперацыяныя і гандлёвыя арганізацыі БССР па могуць гаварыцца вынікані мінулага году ў разгорнутым савецкага гандлю. Тавараварот спажыўкаапэрацыі ў БССР у мінулым годзе складаў 85,2 пляну, астача тавараў па спажыўсыстэме ўвесь год перавышала ліміты. Нагадзалася нездаровая погоня за даходамі пры агульным росьце дэбіторскай задалжанасьці. Прамысловая кааперацыя, якой выпадала значная роля ў пашырэньні тавараабароту, выканала гадавы план выпуску прадукцыі за 11 месяцаў у разьмеры 72 проц.

Усе вышэйпаказаныя недахопы павінны быць улічаны пры вызначэньні пляну фінансаваньня народнай гаспадаркі ў 1932 годзе.

Народна-гаспадарчы і фінансавы пляны БССР на 1932 год пабудаваны з уліком неабходнасьці завяршэньня пяцігодкі за чатыры гады. У адпаведнасьці з гэтым дзяржаўны бюджэт на 1932 год складаецца ў суме 235.750 тыс. руб.—на 50 з лішкам проц. больш фактычнага выкананьня бюджэту мінулага году. 75 проц. усіх даходаў гэтага году дзяржава павінна атрымаць ад аграмадзкапай гаспадаркі (каля 175 млн. руб.).

Зразумела, што ад выкананьня даходнай часткі бюджэту залежыць выкананьне расходнай часткі з яго вялізарнай праграмай фінансаваньня індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і разгортваньня культурнай рэвалюцыі.

Даходы дзяржбюджэту з аграмадзкапай гаспадаркі, як і ўласныя накапленьні дзяржпрадпрыемстваў залежаць ад ступені выкананьня пляну росту прадукцыі і зьніжэньня сабекошту. Ажыцьцяўленьне-ж якасных паказальнікаў немагчыма без сапраўднага ўкараненьня ў работу аграмадзкапай гаспадаркі прынцыпу гаспадарчага разрахунку. У гэтай галіне нам трэба дабіцца пералому: канчаткова і поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку, аўтаматызм у банкаўскім крэдытаваньні, устанавіць сыстэматычны кантроль за скарыстаньнем крэдытных і бюджэтных сродкаў, рашуча ўзмацніць бюджэтна-фінансавай палітыкі зьяўляецца разгортваньне тавараабароту. Кааперацыяныя і гандлёвыя арганізацыі БССР па могуць гаварыцца вынікані мінулага году ў разгорнутым савецкага гандлю. Тавараварот спажыўкаапэрацыі ў БССР у мінулым годзе складаў 85,2 пляну, астача тавараў па спажыўсыстэме ўвесь год перавышала ліміты. Нагадзалася нездаровая погоня за даходамі пры агульным росьце дэбіторскай задалжанасьці. Прамысловая кааперацыя, якой выпадала значная роля ў пашырэньні тавараабароту, выканала гадавы план выпуску прадукцыі за 11 месяцаў у разьмеры 72 проц.

Усе вышэйпаказаныя недахопы павінны быць улічаны пры вызначэньні пляну фінансаваньня народнай гаспадаркі ў 1932 годзе.

Народна-гаспадарчы і фінансавы пляны БССР на 1932 год пабудаваны з уліком неабходнасьці завяршэньня пяцігодкі за чатыры гады. У адпаведнасьці з гэтым дзяржаўны бюджэт на 1932 год складаецца ў суме 235.750 тыс. руб.—на 50 з лішкам проц. больш фактычнага выкананьня бюджэту мінулага году. 75 проц. усіх даходаў гэтага году дзяржава павінна атрымаць ад аграмадзкапай гаспадаркі (каля 175 млн. руб.).

Зразумела, што ад выкананьня даходнай часткі бюджэту залежыць выкананьне расходнай часткі з яго вялізарнай праграмай фінансаваньня індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і разгортваньня культурнай рэвалюцыі.

Даходы дзяржбюджэту з аграмадзкапай гаспадаркі, як і ўласныя накапленьні дзяржпрадпрыемстваў залежаць ад ступені выкананьня пляну росту прадукцыі і зьніжэньня сабекошту. Ажыцьцяўленьне-ж якасных паказальнікаў немагчыма без сапраўднага ўкараненьня ў работу аграмадзкапай гаспадаркі прынцыпу гаспадарчага разрахунку. У гэтай галіне нам трэба дабіцца пераломy: канчаткова і поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку, аўтаматызм у банкаўскім крэдытаваньні, устанавіць сыстэматычны кантроль за скарыстаньнем крэдытных і бюджэтных сродкаў, рашуча ўзмацніць бюджэтна-фінансавую дысцыпліну, забясьпечыць своечасовую і поўную перадачу ўсіх належачых бюджэту сум.

Неабходна ўстанавіць цесную залежнасьць расходаваньня сродкаў ад якасьці работы ўсіх гаспадарчых арганізацый і прадпрыемстваў. Гэта першая, асноўная ўмова пасьпяховага выкананьня фінансавай праграмы бягучага году. Асабліва увагі патрабуе падатак са звароту, які па ўсёй агрэгатнай гаспадарцы БССР павінен даць у агульна-саюзны, рэспубліканскі і мясцовы бюджэты каля 270 млн. руб.

Новы закон аб рэ

Таварную прадукцыю СКТФ—дзяржаве

Выкрываць кулацкую сутнасьць і бязьлітасна змагацца з месьніцкімі, рвацкімі тэндэнцыямі, з разбазарваньнем мяса

Павысіць тэмпы жывёлазагатовак

На 10 лютага квартальны плян жывёлазагатовак па рэспубліцы выкананы на 16,9 проц. супроць 14,6 проц. на 6 лютага. Па сыстэме аспоўнага загатоўчыка—Белжагатскот — плян выкананы на 17,8 проц., з якіх буйной рагатай жывёлы—27,9 проц., сьвіней—5,5 проц., авец—27,3 проц.,

Ня глядзячы на зусім выразныя дырэктывы ЦК партыі і СНК аб узмацненьні тэмпаў загатовак, пасобныя раённыя арганізацыі ня прымаюць патрэбных мер, каб гэтыя дырэктывы ператварыць у жыцьцё.

У выніку самацёку, апортуністычнай бязьдзейнасьці некаторых раённых арганізацый, сельсаветаў, загатоўшчыкаў, адсутнасьці барацьбы з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі ў пасобных калгасах і фермах у радзе раёнаў за апошнюю дэкаду не дасягнута амаль ніякага зруху. Так, па Аояньцкім раёне квартальны плян жывёлазагатовак на 10 лютага выкананы н 11,1 проц., Клімавіцкім—7,5 проц., Крычаўскім—11,7 проц., Пятрыкоўскім—8,6 проц., Прапойскім—6,3 проц., Чырвона-Слабодзкім—9,5 проц. і г. д.

Зусім недапушчальным трэба лічыць ігнараваньне загатовак сьвіней. У гэтай галіне няма ніякага пералому. У Карысаўскім раёне па сьвіньнях загатоўлена ўсяго 0,89 проц. пляну. На мясных няма ніякай работы па разгортваньні жывёлазагатовак, адсутнічае сапраўдная барацьба за сьвіньню.

Разам з тым матар'ялы з месц сьвядчаць аб абураючых фактах разбазараньня жывёлы па мясцовых патрэбы, аб пазыцыі ў некаторых калгасах і фермах кулацка-рвацкіх настроеў, спроб апушчаць дзяржаву.

Так, СКТФ калгасу «Спрах ворагам», Лёзьнянскага раёну, здала дзяржаве ў чацьвертым квартале ўсяго 14 цэнт. мяса, забіта-ж для сваіх уласных патрэб 25 шт. жывёлы, што складае 22 цэнт. За ўвесь год забіта для ўласных патрэб буйной рагатай жывёлы 25 шт., авец—59. СКТФ камуны «Інтэрнацыянал», Брынкаўскага сельсавету, гэтага-ж раёну, не здала дзяржаве ніводнага цэнтнара мяса.

Яшчэ больш абураючае становішча ў СКТФ калгасу «Бальшавік», Старадарожскага раёну, дзе па працягу кароткага часу забіта для ўласных патрэб 67 шт. жывёлы. Абавязак-жа перад дзяржавай ня выкананы. У чацьвертым квартале замест 50 сьвіней здана толькі 7.

Гэта магло здарыцца ў выніку кулацкай дзейнасьці, адсутнасьці кантролю і канкрэтнага кіраўніцтва з боку мясцовых арганізацый і пасобных райкалгасаюзаў.

Сьмілавіцкі цэнтр, Белжагатскот і іх зьвены па мясцох не вядуць у патрэбнай меры барацьбы з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі, з месьніцтвам.

Змагаючыся за ўзьвышэньне тэмпаў жывёлазагатовак, партыйныя і загатоўчыя арганізацыі павінны разгарнуць рашучую барацьбу за поўнае і своечасовае выкананьне пляну па здачы (продажу) дзяржаве таварнай прадукцыі, выкрываючы перад шырокімі масамі калгасьнікаў і беднякоў і сераднякоў аднасобнікаў кулацкую сутнасьць і шкодніцкасьць рвацкіх месьніцкіх тэндэнцый і наносіць па гэтых тэндэнцыях руйнуючы удар. Ва ўсіх без выключэньня калгасах і фермах неабходна безадкладна наладзіць строгі ўлік выхаду і кантроль над здачай таварнай прадукцыі, асабліва па сьвінагадоўчых фермах.

Раённыя арганізацыі ня ў курсе спраў...

КРУПКІ. (Наш спецкор.).

Крупскі раён вельмі адстае ў выкананьні пляну жывёлазагатовак. На 1 лютага квартальнае заданьне рэалізавана на 3,9 проц.

У радзе сельсаветаў загатоўкі зусім не разгорнуты. Ігрушацкі сельсавет выканаў плян толькі на 0,5 проц., Абчугскі — 0,9 проц., Хацюхоўскі — 0,8 проц., Дубаўскі — 1,1 проц., Сакаловіцкі — 1,7 проц., Шыпкаўскі — 2,9 проц.

Наводле дырэктывы, СНК БССР загатоўкі ў 1932 годзе павінны праходзіць у аспоўным за лік сьвіней. Гэта дырэктыва ігнаруецца. Так, па раёне сьвіней загатоўлена 1,9 проц. пляну, а рагатай жывёлы — 7,9 проц., авечак — 7,1 проц. Зразумела, што такія тэндэнцыі ў жывёлазагатоўках супярэчаць дырэктывам партыі і ўраду аб развіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Нездавальняюча праходзяць загатоўкі па індывідуальным сэктары. На Відзішкім сельсавеце па цьвёртых заданьнях спагнана з кулацка-заможных гаспадарак 11,6 проц. пляну, Траянаўскім — 20 проц., а Сакаловіцкі, Смародзінскі, Ухвальскі і некаторыя іншыя сельсаветы паогул ня вядуць, колькі спагнана жывёлы з кулацка-заможных гаспадарак.

Не адпаецца належнай увагі кантрактацыі. Раённыя арганізацыі ня ў курсе ходу загатовак паогул і кантрактацыі жывёлы у прыватнасьці.

Спажывецкай кааперацыяй ня выканана дырэктыва аб арганізацыі калектыўнай гадоўлі сьвіней. Ва многіх мясцох да гэтай работы нават і не прыступалі. Недапушчаецца пытань не аб гадоўлі малапяка. Пагледзецца масавае вынішчэньне маладзяка, галоўным чынам, цялят, асабліва па Ўзнацкім, Шэйскім і інш. сельсаветах.

Некаторыя раённыя арганізацыі і работнікі недаацэньваюць значэньня жывёлазагатовак, як адказнай гаспадарча-палітычнай кампаніі, і не вядуць вакол яе масавай работы. Сакратар РВК т. Цьтавец заўважае: «Нам няма часу займацца жывёлазагатоўкамі, у нас ёсьць больш важныя справы».

Па Крупскім раёне ёсьць рад калгасаў, якія па-ўдарнаму вядуць барацьбу за мяса і ў гэтай галіне дабіліся значных посьпехаў. Калгасы «Чырвоны Кастрычнік», «Чырвоны вострaў», «Чырвоны колас» і інш. выканалі поўнасьцю заданьне па ўкамплектаваньні малочна-таварных фэрм і цяпер разгортваюць барацьбу за здачу таварнай прадукцыі.

Крупскі раён мае ўсе магчымасьці для пасьпяховага выкананьня пляну жывёлазагатовак.

Я. Козік.

„Уласныя патрэбы" супроцістаўляюцца інтарэсам дзяржавы

СТАРЫЯ ДАРОГІ.

На СТКФ калгасу «Бальшавік», Старадарожскага раёну, выцілены абураючыя факты разбазараньня таварнай прадукцыі, якая падлягае здачы дзяржаве. На 1 студзеня 1931 г. на фэрме налічвалася 131 сьвіньня, а на 1 студзеня 1932 г. ёсьць 137 шт. Дакладка ўстанавіць прыплод, упадак, забой сьвіней за мінулы год не прадстаўляецца магчымым. Адкаведных дакумантаў няма. Па тых вестках, якія ёсьць у калгасе, для ўласных патрэб калгасьнікаў забіты 22 сьвіньні, 20 шт. буйной рагатай жывёлы, 25 авец.

У чацьвертым квартале замест 50 шт. дзяржаве здана ўсяго 7 сьвіней.

На фэрме — поўная безгаспадарчасьць. Будынкі не прыстасаваны для ўтрыманьня сьвіней. Сьвінаматкі паросяцца ў грязі. Ёсьць выпадкі замарожаньня сьвіней.

Характэрна, што загатчык СТКФ член партыі Бахановіч ня ведае, колькі на фэрме ёсьць сьвіней.

Райкалгасаюз, РВК ня кіруюць фэрмай і не вядуць барацьбы з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі. Не змагаецца з гэтымі агіднымі праяўленьнямі і мясцовага парт'ячэйка.

С.

Вынік апартуністычнай бязьдзейнасьці

БАРЫСАЎ. (БЕЛТА).

У выніку поўнай бязьдзейнасьці некаторых мясцовых арганізацый і асабліва загатоўшчыкаў, Барысаўскі раён апынуўся ў глыбокім тыле жывёлазагатовак. Да гэтага часу пляны загатовак да ратуш сельсаветаў не даведзены. Пасобныя калгасы і сельсаветы ня ведаюць, колькі патрэбна буйне здаць жывёлы.

Плян загатовак па раёне выкананы усяго на 8,9 проц. Загатоўлена буйной рагатай жывёлы 6,12 проц., сьвіней—0,89 проц., авец — 0,93 проц.

Дрэнна адбіваецца на ходзе мясазагатовак злачынная практыка райспажыўсаюзу, які разбазарыў прамтварныя фонды, вызначаныя для праміраваньня мясаздатчыкаў.

Аб рэарганізацыі загатоўчага апарату

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

Савет Народных Камісараў пастанаўляе:

1) Арганізаваць пры Савеце Працы і Абароны камітэт па загатоўках сельска-гаспадарчых прадуктаў, усклаўшы на яго рэгуляваньне і агульнае кіраўніцтва ўсімі загатоўкамі.

2) Усе апэрацыі па загатоўках збожжа-фуражных культур, бавоўны, ільну, пянькі, і алейнага сёмя камітэту па загатоўках пры СПА ажыцьцяўляць праз непасрэдна яму падпарадкаваныя загатоўчыя органы. Апэраційнае кіраўніцтва загатоўкамі іншых прадуктаў ускласьці на адпаведныя народныя камісарыяты і Цэнтрасаюз, якія павінны праводзіць загатоўкі па плянах і дырэктывах камітэту па загатоўках пры СПА.

3) У адпаведнасьці з гэтым арганізаваць пры камітэце па загатоўках пры СПА:

а) адзіную агульна-саюзную дзяржаўную арганізацыю па загатоўцы збожжавых, бабовых, крупяных, алейных і фуражных культур — «Заготзерно» на аснове аб'яднаньня збожжазагатоўчых апаратаў Саюзхлеба, Хлебжывёлацэнтра і Цэнтрасаюзу са сканцэнтраваньнем у веданьні «Заготзерно» элеватарнай гаспадаркі, за выключэньнем элеватараў экспартхлеба і спэцыяльных прымылавых элеватараў, а таксама ўсіх складаў па прыёмцы збожжа і ўсіх млынавых прадпрыемстваў, якія бяруць гарнцавы збор;

б) адзіную агульнасаюзную дзяржаўную арганізацыю па загатоўках ільну і канапель — «Заготлён» на аснове аб'яднаньня ільназагатоўчых апаратаў сельска-гаспадарчай і спажывецкай кааперацыі з перадачай у веданьне «Заготлён» усіх складаў па прыёмцы, сартаваньні і транспартаваньні ільну, пянькі, ільняного і канапляного сёмя;

в) усесаюзнае аб'яднаньне па загатоўцы бавоўны «Заготхлопок» з перадачай у яго веданьне ўсяго загатоўчага апарату бавоўняных трэстаў і базаўчэрай сельска-гаспадарчай кааперацыі.

4. «Заготзерно», «Заготлён» і «Заготхлопок» знаходзяцца ў непасрэдным падпарадкаваньні камітэту па загатоўках пры СПА і праводзяць работу па загатоўках праз сетку рэспубліканскіх, краёвых (абласных), раённых або міжраённых загатоўчых кантор і пазвую сетку загатоўчых пунктаў.

5. Загатоўкі жывёлы сканцэнтраваць у Народным Камісарыяце Снабжэньня Саюзу ССР, стварыўшы на аснове аб'яднаньня жывёлазагатоўчага апарату Саюзмяса, Хлебжывёлацэнтру і Цэнтрасаюзу адзіную агульнасаюзную дзяржаўную арганізацыю па загатоўках жывёлы — «Заготскот».

6. Загатоўкі плодагародніны, малака, масла, птушкапрадуктаў і прадуктаў дробнай жывёлагадоўлі (трусы, дзіч і інш.) ускласьці на адпаведныя загатоўчыя аб'яднаньні Наркамснабу (Саюзптушкапрадукт, Саюзмалако, Саюзплодагародніна і інш) і на сыстэму спажывецкай кааперацыі, пакінуўшы ў сыстэме спажыўкаапэрацыі маслазаводы, якія належаць ёй і перадаўшы ёй адпаведную частку яйка-птушных складаў у неасноўных раёнах загатовак птушкапрадуктаў.

7. Шырока разгарнуць дэцэнтралізаваньня загатоўкі плодагародніны, малака і дробнай жывёлагадоўлі па лініі ЗРК, транспартнай, рыбацкай і інш. аўтаномных сэкцый спажыўкаапэрацыі, сталовых аб'яднаньняў нархарч і ўсекахарч і сыстэмы дзяргандлю.

8) Загатоўкі сыроў харча-смакавай прамысловасьці (буракі, табак, махорка, бульба і інш.) пакінуць у веданьні Наркамснабу Саюзу ССР, які праводзіць загатоўкі па табаку і махорцы праз спэцыяльныя загатоўчыя аб'яднаньні «Табаксырьё», па буракох, тэхнічнай бульбе, плодагародніне і малаку праз пераапрацоўчыя прадпрыемствы сваіх прамысловых аб'яднаньняў («Сокосахар», Союзмаслапрам, Саюзмалако, Саюзконсерв, Саюзсыйрт, крухмала-патачная прамысловасьць і г. д.).

9) Перадаць у веданьне Наркамату лёгкай прамысловасьці загатоўкі воўны, скуры, повалубяных культур і ўцільсырцу, за выключэньнем харчовага ўцільсырцу, які загатаўляецца Наркамснабам, сканцэнтраваўшы гэтыя загатоўкі ў спэцыяльных дзяржаўных загатоўчых органах (Саюзагатшэрсьць, Саюзагатскур і інш), якія праводзяць загатоўкі як праз уласную загатоўчую сетку, так і праз пазвую сетку спажывецкай кааперацыі (спажыўтаварыствы, крамы).

10) Загатоўку пушнины, футравога сырцу, лектэхсырцу і экспартных адкідаў тавариага сырцу (шчаціне, конскі волас, пух і пер'е, рогі, капыты і інш.) ускласьці на адпаведныя загатоўчыя органы Наркамату замежнага гандлю, Наркамснабу, Наркамлесправу і кааперацыйныя загатоўчыя органы.

11) Перадаць дзяржаўным загатоўчым аб'яднаньням, камітэтам па загатоўках пры СПА, аб'яднаньням Наркамснабу, Наркамату лёгкай прамысловасьці і Наркамату замежнага гандлю Саюзу ССР адпаведны загатоўчы апарат с.-г. кааперацыі і яе больш або менш буйныя пераапрацоўчыя прадпрыемствы, прызначыўшы направільнай перадачу млынавых прадпрыемстваў і маслазаводаў калгасам і іх аб'яднаньням.

12) Устанавіць, што ў сваёй загатоўчай рабоце ўсе народныя камісарыяты падначальваюцца камітэту па загатоўках пры СПА, які ажыцьцяўляе кіраўніцтва загатоўкамі па збожжы, ільне і бавоўне праз свае спэцыяльныя загатоўчыя органы («Заготзерно», «Заготлён» і «Заготхлопок») і іх мясцовыя адзяленьні, а па другіх відах загатовак — праз адпаведныя наркаматы.

13) Камітэт па загатоўках пры Савеце Працы і Абароны мае сваіх упаўнаважаных у саюзных рэспубліках, краёх і вобласьцях.

14. Даручыць камітэту па загатоўках пры СПА ў 5-дзённы тэрмін устанавіць парадак перадачы загатоўчага апарату і кадраў сельска-гаспадарчай кааперацыі адпаведным загатоўчым органам.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Кіраўнік справамі Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
П. КЕРЖАНЦАЎ.

13 лютага, Масква, Крамль.

Агляд друку

АРГАНІЗАТАРЫ КАЛГАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ

(„Мэтпромавец" – Віцебск, „Чырвонае верацяно"—Магілеў)

«АКАЖАМ КАНКРЭТНУЮ ДАПАМОГУ ПАДШЭФНЫМ КАЛГАСАМ У СПРАВЕ ІХ АРГАНІЗАЦЫЙНА - ГАСПАДАРЧАГА УМАЦАВАНЬНЯ»

З такім лёзунгам «МЭТПРОМАВЕЦ» — газэта машынабудаўнічага заводу «Чырвоны мэталіст» (Віцебск) —уступіла ў конкурс «Правды» па дапамозе выкананьне задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. За лёзунгам ідзе канкрэтная работа. Газэта кідае ў падшэфныя калгасы сваіх рабкораў-ударнікаў. Разам з заводскім рабкораўскім актывам «Мэтпромавец» бярэ на сябе практычныя абавязацельствы:

«АРГАНІЗАВАЦЬ У КОЖНЫМ КАЛГАСЕ ПАДШЭФНАГА БАБІНІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ ВЫДАНЬНЕ 3-ХДЗЕННЫХ, А ДЗЕ МАГЧЫМА І ШТОДЗЕННЫХ ГАЗЭТ. ДАБІЦЦА 100 - ПРОЦ. ВЫКАНАНЬНЯ ЗАГАТОЎЧЫХ ПЛЯНАЎ І ПРАВІЛЬНАГА РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ЎРАДЖАЮ Ў КАЛГАСАХ. ПЕРАДАЦЬ ВОПЫТ АРГАНІЗАЦЫЙНА-МАСАВАЙ РАБОТЫ «МЭТПРОМАЎЦА» РЭДКАЛЕГІЯМ І СЕЛЬКОРАМ КАЛГАСАЎ ПАДШЭФНАГА СЕЛЬСАВЕТУ. ПЕРАДАЦЬ КАЛГАСЬНІКАМ ВОПЫТ ЎДАРНІЦТВА І САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА НА ЗАВОДЗЕ З МЭТАЙ УКАРАНЕНЬНЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ МЭТАДАЎ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ».

Заклікаўшы рукавы, «Мэтпромавец» на заводзе і брыгады друку ў падшэфных калгасах бярэцца за выкананьне сваіх абавязацельстваў. З нумару ў нумар «Мэтпромавец» адводзіць свае поласы пытаньням арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Газэта трымае ўвесь заводскі калектыў у курсе таго, як разгортваецца конкурс «Правды». Брыгады друку сыстэматычна разгартваюць рабочым заводу праз «Мэтпромавец» аб сваёй рабоце ў падшэфных калгасах:

«НАША БРЫГАДА АРГАНІЗАВАЛА Ў КАЛГАСЕ 3-ХДЗЕННУЮ ГАЗЭТУ. НАЛАДЖАН ЧЫРВОНЫ АБОЗ СА ЗБОЖЖАМ І ІЛЬНОМ. ВЯДЗЕЦЦА РАБОТА ПА АРГАНІЗАЦЫІ КУЗЬНІ ДЛЯ РАМОНТУ ІНВЭНТАРУ...»

Так пішуць аб сваёй рабоце ў калгасе «1-ы май» рабкоры Іваноў і Тапорскі. «Мэтпромавец» актыўна змагаецца за ліквідацыю абязьлічкі ў калгасах і ўзнімае працоўчай дысцыпліны. У калгасе «Прагрэс» брыгады друку праводзяць рэйд па праверцы рэалізацыі 6 умоў т. Сталіна. Брыгада рапартуе заводу, што «абязьлічка ў калгасе ліквідавана», і даказвае гэта канкрэтнымі фактамі. Тут-жа папулярызуецца вопыт перадавікоў калгаснай вытворчасьці:

«ПА ЛІКВІДАЦЫІ АБЯЗЬЛІЧКІ НАПЕРАДЗЕ ІДЗЕ ПРУЗОЎСКАЯ БРЫГАДА. БРЫГАДЗІР ТАВ. РАДЗІВОНАЎ ПА - БАЛЬШАВІЦКУ КІРУЕ СВАЕЙ БРЫГАДАЙ. У БРЫГАДЗЕ ІНВЭНТАР ЗАХОВАН У ПАРАДКУ. ЖЫВЕЛА СТАІЦЬ У АЦЕПЛЕНЫХ ХЛЯВОХ, КОРМ ВЫДАТКОЎВАЕЦЦА ПА НОРМЕ. АПРАЦОЎКА ІЛЬНАВАЛАКНА СКОНЧАНА І ЛЁН ЗДАН ДЗЯРЖАВЕ. ПРАЦАДНІ ЗАПІСВАЮЦЦА РЭГУЛЯРНА».

І такіх фактаў ня мала.

Сіла газэты ў тым, што яна пачатую справу даводзіць да канца і пры тым з посьпехам. Яркі прыклад—яе барацьба за збожжа. Падшэфны калгас «Бальшавік» недапушчальна адстаў у выкананьні збожжазагатоўчых плянаў. «Мэтпромавец» на сваіх старонках рэзка крытыкуе адставаньне калгасу і дабіваецца ад калгасьнікаў абяцаньня выкаць у тэрмін увесь загатоўчы плян. Абяцаньне не засталося пустым гукам. Сваё слова калгасьнікі «Бальшавіка» стрымалі. У № 77 «Мэтпромаўца» «Бальшавік» паведамляе рабочым «Чырвонага мэталіста» аб сваёй:

«ПЕРАМОЗЕ НА ФРОНЦЕ ЗАГАТОВАК. НА 12 СЬНЕЖНЯ 1931 Г. КАЛГАС «БАЛЬШАВІК» ПЕРШЫМ З КАЛГАСАЎ БАБІНІЦКАГА САЕЛЬСАВЕТУ ВЫКАНАЎ УСЕ ВІДЫ ЗАГАТОВАК. ЗАРАЗ МЫ ПРЫСТУПІЛІ ДА ВЫКАНАНЬНЯ СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНУ».

30 сьнежня «Мэтпромавец» зьмясьціў справаздачу першай брыгады, якая выкажкала ў Бабінічкі сельсавец. Рабкоры-ўдарнікі рапартавалі заводскаму калектыву канкрэтнымі справамі:

«ВА ЎСІХ КАЛГАСАХ АРГАНІЗАВАНЫ 3-ХДЗЕННЫЯ ГАЗЭТЫ «НА ШТУРМ». ЗА ГЭТЫ ЧАС КАЛГАСЫ СКОНЧЫЛІ УСЕ ВІДЫ ЗАГАТОВАК, ЗА ВЫКЛЮЧЭНЬНЕМ КАЛГАСУ «1-ГА МАЯ», ЯКІ НЯ ЗДАЎ ЯШЧЭ 25 ЦЭНТ. СЕНА І ІНШ. І КАЛГАСУ «ПРАГРЭС», ЯКІ НЯ ЗДАЎ 4 ЦЭНТ. ІЛЬНАВАЛАКНА. ФІНАНСАВЫ ПЛЯН ТАК. САМА ЎСІМІ КАЛГАСАМІ ЦАЛКАМ ВЫКАНАН. НАСЬЦЕНГАЗЭТЫ ВЯЛІ БАРАЦЬБУ ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ АБЯЗЬЛІЧКІ І ЎРАЎНІЛАЎКІ. КАЛГАСЬНІКІ ПРЫМАЦАВАНЫ ДА РАБОЧАЙ СКАЦІНЫ І ІНВЭНТАРУ. ПЕРАВЕДЗЕНЫ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ ДОЙКА КАРОЎ, МАЛАЦЬБА І РАМОНТНЫЯ РАБОТЫ. НАЛАДЖАНА ПАЛІТВУЧОБА І ВАЙСКОВАЯ РАБОТА. ПРЫСТУПЛЕНА ДА ПЕРАВОДУ КАЛГАСНЫХ БРЫГАД НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК».

Першая брыгада скончыла сваю работу. На зьмену ёй «Мэтпромавец» арганізуе новую брыгаду. Лёзунг газэты:

— Разгортваць і надалей работу па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў—наша задача.

У студзені «Мэтпромавец» уступае ў другі этап конкурсу. На яго старонках разгортваецца барацьба за падрыхтоўку падшэфных калгасаў да веснавой сяўбы. Каналь рабкор тав. Шэйбра па ініцыятыве «Мэтпромаўца» арганізуе ў калгас «1-га мая» рамонтную кузьню. У першай дэкадзе лютага рабкоры «Чырвонага мэталіста», пад кіраўніцтвам «Мэтпромаўца», правяраюць у падшэфных калгасах ход падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі.

Так, канкрэтнае і апэрацыйна пад кіраўніцтвам партыкалектыву газэта змагаецца за ажыцьцяўленьне цэнтральнай задачы калгаснага будаўніцтва—арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Заслуга «Мэтпромаўца» ў тым, што ён зладоў ператварыць конкурс «Правды» ў справу ўсіх рабочых заводу.

* * *

Значна пазьней уключылася ў конкурс шматтыражка фабрыкі штучнага валакна «ЧЫРВОНАЕ ВЕРАЦЯНО» (Магілеў). Першыя матар'ялы аб конкурсе газэта зьмясьціла толькі ў канцы сьнежня 1931 г. Як і «Мэтпромавец», «Ч. В.» арганізавала брыгаду друку для работы ў падшэфным сельсавеце. Справы ў гэтым (Вялікабялевіцкім) сельсавеце ішлі няважна. Сельсавет зацягваў збожжазагатоўкі. Брыгада «Ч. В.» разгортвае ў калгасах сельсавету апэрацыйна-масавую работу і арганізуе калгасьнікаў на барацьбу за збожжа. Брыгада рашуча выкрывае спробы кулакоў, пралезшых у калгасы, разбурыць калгасную вытворчасьць з сярэдзіны. Ва ўпор ставіцца пытаньне аб адрыўцы калгасаў ад класава-варожых элементаў. Выкрываюцца спажывецка-кулацкія тэндэнцыі, якія ў значнай меры тармазілі збожжазагатоўкі.

«Ч. В.» кідае лёзунг: «Вопыт карпусоў фабрыкі—падшэфным калгасам». Рабкоры «Ч. В.» на справе праяўляюць сваю арганізуючую ролю ў справе ўмацаваньня калгаснага друку. У гэтай сваёй рабоце «Ч. В.» ужыла дасканалы мэтад арганізацыі пматтыражкі пры падшэфным сельсавеце. Гэта пматтыражка выходзіць рэгулярна і рассылаецца ва ўсе калгасы.

Аднак, апэрацыйнасьць «Ч. В.» далёка адстае ад апэрацыйнасьці «Мэтпромаўца». Разгортваўшы спакойную вялікую арганізатарскую і масавую работу, «Ч. В.» потым амаль цэлы месяц (з 28 сьнежня па 21 студзеня) не зьмяшчала ніякіх матар'ялаў аб конкурсе «Праўды». Толькі 21 студзеня на старонках «Ч. В.» зьявіліся рапарты сельсавету і пасобных калгасаў. Перадавыя калгасы і старшыні сельсаветаў, якія дабіліся лепшых вынікаў у арганізацыі калгаснай вытворчасьці, па ініцыятыве «Ч. В.» былі прэміраваны фабкомам. На гэтым «Чырвонае верацяно» супакоілася. Рэдакцыя «Ч. В.» пакінула лагічна сваю справу скончанай. Прынамсі, 21 студзеня і па сёмы дзень газэта маччыць. Аб конкурсе ні слова. Гэта грубая памылка.

Па прыкладзе «Мэтпромаўца», «Ч. В.» не павінна ні на мінуту аслабляць сваёй барацьбы за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Асабліваю ўвагу, максымум сілі і энэргіі «Ч. В.», як і ўсёй нізавы друк БССР, павінна аддаць рэалізацыі апошняй пастановы ЦК УсесКП(б) аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Работа кожнай газэты ў справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў будзе ацэньвацца ўмонна па тых вынніках, якіх яна дабіецца ў практычным выкананьні гэтага важнейшага дакумэнту партыі.

ПЯЦЬ ГОД БДТ-2

Барацьбітом за Беларускі пралетарскі тэатр—гарачае прывітаньне

Пад кіраўніцтвам партыі—наперад да новых перамог!

Кудзелька (дырэктар БДТ-2)

На парозе другога пяцігодзьдзя

Адным з яркіх прыкладаў перамогі ленінскай нацыянальнай палітыкі зьяўляецца стварэньне, праробленае ім права і сьвяткаваньне пяцігадовага юбілею БДТ-2. Пяцігодзьдзе існаваньня тэатру — сьвята ня толькі адзнаго тэатру. Гэта сьвята ўсіх працоўных БССР, бо стварэньне сацыялістычнай культуры, пралетарскага нацыянальнага тэатру — ёсьць справа ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Пяцігадовае існаваньне БДТ-2 — гэта адзін з вынікаў барацьбы пралетарыяту, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, за стварэньне вялікага бальшавіцкага мастацтва, за стварэньне пралетарскага тэатру.

Найбольш цяжкім перыядам для БДТ-2 зьяўляецца той час, калі тэатр быў у палоне контр-рэвалюцыйных беларускіх нацыяналістаў, у руках клясавага ворага. Тады (1926-28 г. г.) тэатр, як зброя клясавай барацьбы, быў выкарыстан нацыяналістамі для барацьбы супроць дыктатуры пралетарыяту. Такія п'есы як «Апраметная», «Баханкі», «Зрос і Псыха» здавальнялі патрэбы верхаўніны беларускай буржуазнай інтэлігенцыі, якая ў барацьбе супроць дыктатуры пралетарыяту была цесна зьвязана з фашыцкай Польшчай, выяўляла яе інтэрвэнцыйныя мэты і мераваньні. Дзякуючы правільнаму партыйнаму кіраўніцтву, дзякуючы тэзу, што КП(б)Б канчаткова выкрыла і ўшчэнт разьбіла контр-рэвалюцыйных нацыяналістаў, — тэатр вызвалёны ад буржуазнай ідэалёгіі і чужых творчых мэтадаў, стаў на шлях барацьбы за пралетарскі тэатр.

За першае пяцігодзьдзе свайго існаваньня тэатрам прароблена вялікая работа, але пераважна, у другім пяцігодзьдзі неабходна зрабіць яшчэ больш.

Задачы партыі і савецкай улады на сацыялістычным будаўніцтве зьяўляюцца ў той самы час і задачамі тэатру. Тэатр павінен яшчэ больш актыўна стаць на службу сацыялістычнага будаўніцтва, гартаваць волю і энэргіязм шырокіх мас для яшчэ больш высокіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Задачы БДТ-2 у другім пяцігодзьдзі свайго існаваньня, як і ўсяго пралетарскага мастацтва, выходзяць і акрэсьліваюцца пастаўленай партыяй задачаю ў другую пяцігодку — «Поўнае зьнішчэньне прычын, што нараджаюць клясавую розьню і эксплёатацыю, ліквідацыя пережыткаў капіталізму ў жаномісы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва» (з пастановы XVII партканфэрэнцыі).

Перад намі стаіць задача — перабудаваць усю нашу работу, увесь вымест сваёй вытворчасьці пад кутом сацыялістычнага перавыхаваньня працоўных мас, пад кутом актыўнай работы на завяршэньні першай пяцігодкі і выкананьня задач другой пяцігодкі.

У галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва тэатр павінен узмацніць барацьбу супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, супроць рэшткаў беларускага нацыяналізму і шавінізму розных колераў.

Арабочаньне складу тэатру за лік лепшых ударнікаў, за лік камсамольцаў — выцілеца найважнейшай задачай. Разгорнутая работа БДТ-2 па сувязі з прадпрыемствамі, па ўцягненьні і набліжэньні рабочага глядача да актыўнага і непасрэднага ўдзелу ў падрыхтоўцы новых пастановак павінна быць пашырана ў больш масавым маштабе.

Усе гэтыя задачы патрабуюць ад працаўніцкі тэатру і пралетарскай грамадзкасьці разгортваньня бальшавіцкай крытыкі тэатральнай прадукцыі, бязьлітасная барацьба з правымі і «левымі» апартуністамі, супроць гнілога лібэралізму да клясава-варожых «ідэек» у творы і практыцы тэатральнага фронту.

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, БДТ-2 у далейшай сваёй творчай рабоце задачы, пастаўленыя перад ім, выканае, ператворыць іх у справу славы, справу гонару, адвагі і геройства.

На барацьбу за справу Леніна

Беларуская Акадэмія Навук у сувязі з пяцігадовым існаваньнем 2-га Беларускага Дзяржаўнага Тэатру шчыра вітае калектыў тэатру. Дыктатура пралетарыяту, якая ажыцьцяўляецца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дала небывалы росквіт беларускай сацыялістычнай культуры і забясьпечыла яе далейшае разьвіцьцё. Акадэмія ўпэўнена, што другі Дзяржаўны беларускі Тэатр будзе на перадавых пазыцыях нашай барацьбы за ленінскую нацыянальную палітыку, будзе бязьлітасна выкрываць рэшткі някультурнасьці — гэтага небясьпечнага ворага сацыялістычнага будаўніцтва, будзе натхняць масы на далейшую барацьбу за вялікую справу Леніна — сацыялістычнае будаўніцтва.

Прэзыдыум Беларускай Акадэміі Навук П. ГОРЫ.

ЗА МАГНІТАБУДЫ Ў МАСТАЦТВЕ

Шлю бальшавіцкае прывітаньне калектыву і кіраўніком 2-га Беларускага Дзяржаўнага Тэатру ў сувязі з 5-цігадовым юбілеем.

Рост сацыялістычнага будаўніцтва БССР, разгортваньне культурнай рэвалюцыі стварылі ўмовы для тых перамог, якія мае тэатр у галіне стварэньня беларускага пралетарскага рэпэртуару («Качагары», «Напер»), у галіне сувязі з рабочымі масамі. Гэтыя перамогі зьяўляюцца вынікам барацьбы за генэральную лінію партыі, за ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, супроць вялікадзяржаўнага шавінізму як галоўнай небясьпекі, беларускага нацыянал-дэмакратызму і іншых шавінізмаў, зьяўляюцца вынікам барацьбы за стварэньне мастацтва — нацыянальнага па форме і сацыялістычнага па зьмесьце.

Я ўпэўнен, што БДТ-2, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі і надалей пойдзе па шляху актыўнага змаганьня за тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, паказу сьвядомых будаўнічых сацыялістычнага грамадзтва, стварэньня Магнітабудаў мастацтва, якіх большага ўзмацненьня сувязі з шырокімі масамі, мабілізуючы іх сродкамі мастацтва на выкананьне пляну апошняга году пяцігодкі, на выкананьне задач пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва да канца другой пяцігодкі.

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КП(б)Б ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

Заг. культпропам ЦК КП(б)Б
ЧЭРНУШЭВІЧ.

Андрэй Александровіч

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

Яркім і пераканаўчым фактарам посьпехаў у справе стварэньня, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, беларускай пралетарскай культуры зьяўляецца першае пяцігодзьдзе БДТ-2, як самастойнага тэатру.

Калектыў БДТ-2 крочачы па складаным, творчым шляху, моў вялікія ідэалёгічныя зрывы.

Яшчэ ў часы студыйнай вучобы (1921-25) у асноўным здаровы, таленавіты калектыў студыйцаў таленавіты калектыў студыйцаў атручваўся рэакцыйнай ідэалістычнай школай Станіслаўскага. Першы этап работ БДТ-2 знаходзіўся пад уплывам і кіраўніцтвам беларускіх нацыямаў.

Дзякуючы бальшавіцкаму кіраўніцтву партыйнай арганізацыі і глыбокаму павароту ўсяе пралетарскай грамадзкасьці да задач стварэньня пралетарскага тэатральнага мастацтва, другі БДТ рашуча парваў з кулацка-нацдэмаў

Барацьба за Чапэй і Усун

ПЯХОТА І АРТЫЛЕРЫЯ ГАТОВЫ ДА АТАКІ УСУНА

ШАНХАЙ, 12. Японцы пасылаюць падмацаваньні на ўсунскі фронт. Атрад за атрадам прыбываюць ва Усун, падвозячы пантоны да бухты ўсунскіх фартоў. Пяхота і артылерыя гатовы да атакі Усуна. 9 бомбавозаў, самалёты-знішчальнікі і флёт гатовы да бамбардаваньня Усуна.

НАБЛІЖАЕЦЦА САМАЯ ГРАНДЫЁЗНАЯ БОЙКА

ШАНХАЙ, 12. Японскія войскі разьвіваюць ліхаманкавую дзейнасьць уздоўж Усунскай ваеннай дарогі, а тансама на тэрыторыі японскай канцэсіі, дзе выгружаецца ваенны рыштунак на Усунскі фронт. Наблімаецца самая грандыёзная бойка за ўсю цяперашнюю кампанію. Кітайскія войскі ўмацоўваюць свае пазыцыі і будуюць дротавыя загароджі. Настрой кітайскіх войск застаецца ранейшым. Кітайскае камандаваньне выказвае поўную ўпэўненасьць у тым, што ўсе японскія атакі будуць адбіты.

Разбуран тэхніка-фізычны інстытут ва Усуне

БЭРЛІН, 13. Шанхайскі карэспандэнт «Фосіш э цэйтунг» паведамляе аб поўным разбурэньні тэхніка-фізычнага інстытуту ва Усуне. Гэты інстытут цкацаваў пад кіраўніцтвам германскіх вучоных і меў надзвычай каштоўнае навуковае абсталяваньне. У сувязі з тым, што разбураны кватэры многіх германскіх выдатных прафэсароў, загінулі вельмі каштоўныя рукапісы і бібліятэкі. «Неабходна падкрэсьліць,—указвае карэспандэнт, — што японскае паведамленьне аб тым, што нібы ў кітайскім штабе ва Усуне ёсьць германскія супрацоўнікі, не адпавядае сапраўднасьці». (ТАСС).

Кітайцы ўмацоўваюць Наньдао

ШАНХАЙ, 13. Кітайскія войскі, якія знаходзяцца ў Наньдао (раён у кітайскай частцы Шанхаю) старанна ўмацоўваюць пазыцыі, каб не дапусьціць высадкі маракоў з японскіх суднаў.

Японцы зьбіваюць паліцэйскіх сэтльмэнту

ШАНХАЙ, 13. Муніцыпальная паліцыя чужаземнага сэтльмэнту прабуе часткова прыступіць да выкананьня сваіх абавязкаў у раёне Ханькю, але сустракае супраціўленьне з боку японскіх узброеных рэзэрвістаў. Апошнія зьбіваюць паліцэйскіх агентаў.

Абвяржэньне ТАСС

З аўтарытэтных колаў ТАСС паведамляюць, што чуткі аб сакрэтнай згодзе паміж Японіяй і СССР наконт Манчжурыі, або па якіх-небудзь іншых пытаньнях — не адпавядаюць сапраўднасьці і зьяўляюцца плодам яўнага непаразуменьня. Магчыма, што гэтыя выдуманыя чуткі маюць на ўвазе прапанову СССР аб заключэньні пакту аб ненападзе. Але аўтарытэтныя колы паведамляюць, наконт гэтага, што ад японскага ўраду да гэтага часу яшчэ не атрыман адказ на прапанову савецкага ўраду аб пакце ненападу, пераданую ў свой час тав. Літвінавым Іосізаво.

Спроба супрацоўнікаў японскага консульства ва Уладывастоку прабрацца на Дальзавод

УЛАДЫВАСТОК. 13. 17 студзеня два японцы падышлі да брамы Дальзаводу (Уладывасток) і прабавалі прабрацца на завод. На патрабаваньне вартавога пакінуць тэрыторыю заводу, японцы адказалі адмоўна. Вартавы выклікаў карэвульнага начальніка, пры прыходзе якога японцы пачалі хутка ўцякаць, аднак, яны былі дагнаны і затрыманы. Затрыманыя аказаліся: адзін—сакратаром японскага консульства ва Уладывастоку — Сакабэ, другі — супрацоўнікам консульства — Сіосеяму Мі Гота. Пасьля высьвятленьня асоб абодва японцы былі адпушчаны.

ПРАМОВА т. ЛІТВІНАВА—У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ ПРЭСЫ ЎСЯГО СЬВЕТУ

Водгукі ангельскай і францускай прэсы

ЛЕНДАН. Камэнтуючы прамову тав. Літвінава, жэнэўскі карэспандэнт кансэрватыўнай «Таймс» указвае, што найбольш цікавым месцам у прамове Літвінава было тое, дзе ён выступіў з першай рашучай крытыкай францускага праекту.

Ваенны карэспандэнт кансэрватыўнай «Дэйлі тэлеграф»—капітан Лідэль Харт, які знаходзіцца зараз у Жэнэве, указвае, што прамова Літвінава сваёй лёгкай зрабіла вялікае ўражаньне. Жэнэўскі карэспандэнт кансэрватыўнай «Морнінг Пост» піша, што Літвінаў «бязьлітасна раскрытыкаваў францускія прапановы».

Жэнэўскі карэспандэнт кансэрватыўнай «Дэйлі Мэйль» адзначае, што Літвінаў «высьмяяў» францускія прапановы.

Жэнэўскі карэспандэнт лейбарыстскай «Дэйлі Геральд» падкрэсьлівае, што зроблены Літвінавым аналіз францускай прапановы быў «зьнічальным». Карэспандэнт піша: «Ня было прамовы, якая прымусіла-б столькі думаць. Слухаўшыя яе заставалі сабе пытаньне—ці не зьяўляецца савецкая прапанова сапраўды самым правільным і простым шляхам вырашэньня праблемы разбраеньня».

***

ПАРЫЖ. 12. «Ом лібр», закранаючы прапановы т. Літвінава аб скарачэньні ўзбраеньняў, піша, што «Германія, Італія і СССР жадаюць шанесьці сьмяротны ўдар бясьпечнасьці Францыі» і заклікае «не дапусьціць пэратварэньня канфэрэнцыі па ўсеагульным разбраеньні ў канфэрэнцыю па разбраеньні Францыі».

«Эр Нувэль» побач са звычайнымі выпадамі супроць СССР выказвае пачаканую заклапочанасьць лёсам «лімітрофаў», якім ў выпадку прыняцьця прапановы Літвінава, будзе пагражаць расійскі напад».

«Юманіта» заяўляе: «У прамове Літвінава на канфэрэнцыі па разбраеньні загаварыў другі сьвет. Паміж прамовамі папярэдніх прамоўцаў і прамовай Літвінава існуе ня розьніца адценьняў, а розьніца прыродная, розьніца клясавая. Тут стыкнуліся дзьве сыстэмы: сыстэма брацкага супрацьцьця народаў і сыстэма галечы мільёнаў, дзяржава, якая ня мае беспрацоўя, ня ведае зруйнаваньня сялянства, дзяржава калгасаў і сыстэма банкаўскіх крахаў і бюджэтных дэфіцытаў».

«Цяперашняя канфэрэнцыя,—піша газэта,—пясумненна апошняя канфэрэнцыя напярэдадні новай вялікай вайны. Яна займаецца гутаркамі ў той час, як вайна ўжо лютуе. За гэтай кафэрэнцыяй пясумненна пасьледуе ўзмацненьне жорсткага суперніцтва імпарыялістаў ва ўзбраеньнях. Таму цяперашняя канфэрэнцыя — перадвасенняя канфэрэнцыя». (ТАСС).

МАГУТНЫЯ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ РАБОЧЫХ Ў ЧЭХА-СЛАВАКІІ

ПРАГА, 13. На гледзячы на забарону ўсякіх дэманстрацый і на паліцэйскія рэпрэсіі (масавыя выбускі ў намінаваных кампартыі, арышт некалькіх сотэнь актыўных рабочых-кампартыі, канфіскацыя адозваў і камуністычных газэт і г. д.), учора па ўсёй Чэха-Словакіі адбыліся магутныя рабочыя дэманстрацыі, прычым у радзе месц гэтыя дэманстрацыі адбываліся побач з забастоўкамі.

Згодна атрыманых пакуль вяшоўных звестак, найбольш магутныя выступленьні адбыліся ў Закарпацкай Украіне, дзе, ня гледзячы на мабілізацыю усёй жандармэрыі, амаль усюды адбыліся дэманстрацыі рабочых, беспрацоўных і працоўнага сялянства, прычым ва многіх мясцох адбыліся сур'ёзныя сутычкі. У Перчыне 3 тыс. дэманстрантаў прарвалі жандарскі кардон, які прабаваў не дапусьціць дэманстрантаў у горад. У часе сутычкі было паранена 60 дэманстрантаў і 16 жандараў. Жандары былі вымушаны адступіць, і дэманстранты, прайшоўшы цэнтр горада, наладзілі вялікі мітынг перад будынкам муніцыпалітэту. У Звалэе ўвесь учарашні дзень прайшоў пад знакам рэвалюцыйных дэманстрацый, у якіх прымала ўдзел 3 тыс. чалавек. Жандары не адважыліся нават зрабіць спробу перашкодзіць дэманстрацыі і не паказваліся на вуліцах.

З Словакіі паведамляюць, што сур'ёзныя сутычкі адбыліся ў Шала дзе два жандарскія кардоны прабавалі затрымаць галодны паход рабочых і працоўных сялян, якія накіроўваліся ў горад. Паміж жандарамі і ўдзельнікамі паходу адбылася сутычка, у рэзультаце якое з абодвух бакоў ёсьць параненыя. Жандары былі вымушаны адступіць. Магутныя дэманстрацыі адбыліся ў Пажочай Багеміі.

Шматлікія дэманстрацыі адбыліся і ва ўсіх іншых рабочых Чэха-Словакіі, у прыватнасьці, у прамысловым раёне Вострава.

У Празе, дзе паліцыя правяла асабліва шырокія мерапрыемствы па прадухіленьні рэвалюцыйных выступленьняў і дзе паліцэйскія атрады снабжаны сьлёзатачывымі бомбамі і сякцоцыяльнымі брандзбойтамі для разгону дэманстрацый і былі разьмешчаны амаль на ўсіх прадпрыемствах, адбылося вечарам 14 дэманстрацый. У часе гэтых дэманстрацый было арыштавана шмат рабочых, у тым ліку некалькі камуністычных дэпутатаў.

У Пільзэне перад ваеннымі заводамі «Шкода» адбылася вялікая дэманстрацыя беспрацоўных з лёзунгамі барацьбы супроць падрыхтоўкі вайны і абароны Савецкага Саюзу. Нашаўшая на дэманстрацыі паліцыя арыштавала 20 рабочых і камуністычнага дэпутата Дворжака.

У Ольмюцы ўсе без выключэньня рабочыя марэўскіх сталялітэйных заводаў правялі мапутны антываенны мітынг. Пасьля мітынгу рабочыя разам з беспрацоўнымі накіраваліся да цэнтру гораду, дзе адбылася сутычка з дзюма жандарыстскімі эскадронамі.

У Боскавіцы супроць дэманстрантаў таксама быў выстаўлен кавалерыйскі эскадрон. У Вагштадце (Маравія) дэманстранты прарвалі жандарскі кардон і прымусілі мясцовыя ўлады прыняць патрабаваньні беспрацоўных. Горад Шэнэберг (Маравія) з раніцы быў занят атрадам у 200 жандараў і войскам. Ня гледзячы на гэта, адбылася дэманстрацыя. У часе дэманстрацыі арыштавана 70 рабочых і камуністычны дэпутат Штэрн.

ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ І ІТР

З адозвы УсеЦСПС

Рабочыя Сталінградзкага і Харкаўскага трактарнага, электразаводу, «Краснога Октября», Краматорскага, «Красного пролетария», «Светланы» прыступілі да распрацоўкі на 1932 год сустрэчных плянаў па імпартнай незалежнасьці, да асваеньня новых відаў вытворчасьці, якія замяняюць імпарт і вызваляюць савецкай краіне мільёны валюты.

Ухваляючы прапановы рабочых раду заводаў, апублікаваныя ў газэце «За индустриализацию», аб арганізацыі на прадпрыемствах на працягу лютага і сакавіка масавай прапрацоўкі сустрэчных плянаў імпартнай незалежнасьці, УсеЦСПС заклікае ўдарнікаў і спэцыялістаў, у першую чаргу, машынабудаўнічай і электрабудаўнічай прамысловасьці — разгарнуць баявую работу па вытлуценьні ўсіх унутраных рэсурсаў кожнага агрэгату, кожнага вытворчага вучастку для пастаноўкі новых вытворчасьцяй, якія замяняюць імпарт, і для рашучага скарачэньня наяўных імпартных заявак. Выкананьне сустрэчных плянаў імпартнай незалежнасьці павінна перш за ўсё задаволіць патрэбы вядучых галін народнай гаспадаркі—металюргіі, вугалю і транспарту. Для пасьпяховага ходу гэтай работы УсеЦСПС прапануе:

1. Прафсаюзным арганізацыям на працягу лютага і сакавіка разгарнуць спаборніцтва заводаў, цэхаў і брыгад на лепшы сустрэчны плян імпартнай незалежнасьці, складзены на аснове сапраўднага вытлуценьня ўнутраных рэсурсаў прадпрыемства і накіраваны на забесьпячэньне асноўных, вядучых галін народнай гаспадаркі. У працэсе распрацоўкі сустрэчных плянаў неабходна шырэй разгарнуць кампаніраваньне прадпрыемстваў, зьвязаных паміж сабою і ўзаемазалежных у справе вызваленьня ад імпарту.

2. Заводзкім камітэтам арганізаваць праз вытворчыя нарады і ячэйкі выгаходдаў прамадзкую праверку ўсіх заявак на імпарт, выявіць магчымасьці скарачэньня гэтых заявак за лік унутранога вырабу і ў далейшым стварыць пастаянныя грамадзкія заслоны з лепшых ударнікаў, вынаходнікаў, інжынэрна-тэхнічных работнікаў супроць ліпняга імпарту.

3. УсеМБІТ і цэнтральнаму савету таварыства вынаходцаў мабілізаваць сакцыі ІТР і ячэйкі вынаходцаў на вопытнае праектаваньне абсталяваньня, якое імпартуецца, асваеньне новых канструкцый, вынаходзтва новых відаў машын, якія вызваляюць краіну ад імпарту, павінны быць арганізаваны шырокія конкурсы—заводзкія і цэхавыя—на лепшыя прапановы і вынаходзтвы, якія ўмацоўваюць тэхнічна-эканамічную незалежнасьць Савецкага Саюзу.

4. Завяршальны год першай пяцігодкі—год падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай пяцігодкі—павінен стаць годам разгорнутай барацьбы за тэхніка-эканамічную незалежнасьць краіны Саветаў, за шырэйшае вызваленьне ад імпарту. Мы маем усе магчымасьці арганізаванай замены імпарту савецкім машынабудаўніцтвам —«галоўнае тут заключаецца ў тым, каб мець бальшавіцкае жаданьне аўладаць тэхнікай, аўладаць навукай вытворчасьці» (Сталін).

Усесаюзны Цэнтральны Савет прафэсыянальных саюзаў заклікае рабочых і ўдарнікаў, інжынэраў і тэхнікаў праверыць прамфінплян сваіх заводаў і выявіць усе ўнутраныя рэсурсы для замены імпарту.

Да 9-га зьезду прафсаюзы павінны прыйсьці з новымі перамогамі ў барацьбе за ажыцьцяўленьне ленінскага лёзунгу: «Дагнаць і перагнаць перадавую тэхніку капіталістычных краін», глыбока прапрацаванымі і тэхнічна ўгрунтаванымі сустрэчнымі плянамі імпартнай незалежнасьці, якія эканомяць пралетарскай дзяржаве сотні мільёнаў залатых рублёў.

Сакратар УсеЦСПС ШВЭРНІК.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Абсталяваньне вагоннага парку аўта-тормазамі

МАСКВА. Калегія Народнага Камісарыяту Шляхоў Зносін пастанавіла ў 1932 г. абсталяваць аўтатормазамі 100 тыс. таварных вагонаў. 75 тыс. вагонаў будуць абсталяваны тормазамі сыстэмы Казанцава, 25 тыс. — Матросава. Апрача таго, 317 тысяч вагонаў будуць абсталяваны па працягу году пралётнымі трубамі. Такім чынам, да пачатку 1933г. будзе абсталявана аўта-тормазамі звыш 28 проц. усяго вагоннага парку СССР. Асабліва важнае значэньне мае ўжыванне аўтатормазаў на алпанляхових вучастках. У сувязі з пастановай НКПШЗ напыраюцца Яраслаўскі і Маскоўскі тормазныя заворы.

Выпуск сельгасмашын

10-га лютага заводам Гомсельмаш выпушчаны 33 сіласарэзкі (106,4 процантаў пляну), 21 сячкарня (123,5 процантаў), 19 бульбасартовак (112 проц.) і 4 капюшыпасартоўкі (100 проц.).

З 1 па 10 лютага заводам «Чырвоны мэталіст» (Віцебск) выраблена 113 жмыхадрабілак (71,06 проц. пляну), 119 корнярэзак (66,85 проц.), 45 бульбакалькак (40,17 проц.), 230 боран «Зыг-Заг» (40,92 проц.), 17 сячкарань (154,54 проц.), і 1 плуг пумар 14 (6,66 проц.). За гэту дэкаду прамфінплян на заводзе выкананы у цэлым на 57,87 проц.

На рашаючых вучэстках

ВУГАЛЬ. 11 лютага па ўсім Саюзе здабыта 188.906 тон вугалю. 12 лютага па Данбасе здабыта 136.869 тон вугалю.

ТРАКТАРЫ. 12 лютага Сталінградзкі трактарны завод выпусьціў 130 трактараў.

МЭТАЛЬ. 10 лютага па мэталюргічных заводах Саюзу выплаўлена 14.750 тон чыгуну і 13.048 тон сталі (без малой мэталюргіі).

Насустрач бытавым патрэбам рабочых мас

МАСКВА, 13. Наркамат лёгкай прамысловасьці даручыў адпаведным абкамам на працягу бліжэйшага месяца стварыць рад узорных майстэрань для рамонту абутку, вопраткі і трыкатажу, а таксама для пашыўкі вопраткі з матар'ялу заказчыкаў у Маскве, Ленінградзе, Харкаве і іншых важнейшых рабочых цэнтрах. Найбольш шырокую сетку рамонтных пунктаў разгорне «Саюзкожа», якая пераменіла у першую чаргу арганізаваць 30 майстэрань.

Лесапіленьне

За другую пяцігодку лютага Баб руйскі дрэваапрацоўчы камбінат выканаў прамфінплян па расьпілоўцы сырцу на 87,4 проц., па лесазаводзе пумар 6 — на 94,9 проц., лесазаводзе пумар 7 — на 79,3 проц. За гэты-ж час плян выпуску фанэры выкапан на 86,2 проц. Беларэўны цэх даў 87,4 проц., цэх стандартных дамоў — 95.7 проц. праграмы.

Гераічная барацьба кітайскай Чырвонай армії

А. Івін.

Першым усекітайскім зьездам савецкаў (лістапад 1931 г.), на якім быў арганізован у Шычэне часовы цэнтральны ўрад кітайскай савецкай рэспублікі, пытаньне аб аб'яднаньні Кітаю было практычна пастаўлена на парадак дня.

«Наша рабоча-сялянская армія савецкіх вобласьцяй, якая налічвае сотні тысяч, — гаварылася ў адозьве ЦК кітайскай кампартыі да працоўных мас Кітаю,—хоча аб'яднацца з вамі, хоча разам з вамі змагацца за Савецкі Кітай, хоча аб'яднаць раскіданыя зараз савецкія раёны ў адзіную кітайскую савецкую рэспубліку».

Усяго толькі тры месяцы адрэзае нас ад 1-га ўсекітайскага зьезду савецкаў. За гэты час савецкі рух у Кітаі прарабіў не малы шлях. Кітайская чырвоная армія пры значным падтрыманьні Чырвонай і малазай гвардыі, пры падтрыманьні вялікарных мас працоўных савецкіх раёнаў і раёнаў, якія саветызуюцца, атрымала рад значных перамог.

Згодна цьверджаньня ангельскага агэнтства «Рэйтэр», якое грунтуецца на даных, атрыманых з кампэтэнтных афіцыяльных колаў, 60 з 70 наяўных у Хубэі паветаў знаходзіліся ў канцы 1931 г. у руках камуністаў. Чырвоныя паветы кальцом змыкаюцца вакол Ухану. У Цзянсі чырвоная армія ўжо патрапкае сталіцы правінцыі. Палкі і цэлыя брыгады белых далучаюцца да чырвоных.

Пагадзім пяпер, як малюе становішча кітайская рэакцыйная прэса.

«Пачынаючы з першых лістаў сьнежня 1931 г., — піша пэкінскі карэспандэнт «Шэньбао», — у паўднёва-ўсходніх паветах Цзянсі, Мінчжэ паўсюдна перапяць адно паражэньне за другім. У гэты час гуандунскія войскі ў нерашучасьці топчуцца на Гуанцзун-Цзянсійскай граніцы. 26-я армія Сун Лян-гуна і 6-я армія Чу Шао-ляна стомлены баямі і ўжо даўно абмяжоўваюць сваю дзейнасьць толькі абаронай занятых імі павятовых гарадоў. Між іншым Чу-Дэ працярпеў рашучае паступленьне на Поўнач. 4-ы і 7-мы чырвоныя карпусы, пасоўваючыся з Шычэна, атакавалі Гуанчан. Гарнізон Гуанчана адступіў да Паньфіна і Паньчэна. 15 сьнежня чырвоныя заняли Гуанчан. Становішча Паньфіна зрабілася падзвычайна крытычным. У такім-жа становішчы знаходзіцца і Ганьчжоу пасьля заняцьця чырвонымі Сінго і Юйду. Камандуючы Цзянсійскімі арміямі генерал Чу Шао-лян маркуе ад абароны перайсьці ў контрнаступленьне і з гэтай мэтай мае намер даць загад сваім войскам, у тым ліку часьцям Сун Лян-чуна ў шайкарацейшы тэрмін ада браць згубленую тэрыторыю, бо інакш будзе немагчыма выправіць становішча».

Але пакуль генэрал Чу Шао-лян будуе свае пляны, становішча робіцца яшчэ больш сур'ёзным.

«Згодна паведамленьня с Паньчану, — тэлеграфе ангельскае агэнцтва «Рэйтэр»,—дзевяць палкоў (г. зн. па сутнасьці ўся 26-я армія) Сун Лян-чуна, якія знаходзіліся ў цэнтральным Цзянсі, перайшлі на бок камуністаў».

Гэта сэнсацыйнае паведамленьне Рэйтэра хутка паньвярджаецца тэлеграмай з Сватоў.

«Намесьнік камандзіра першай асобнай брыгады, які, прыбыў ў Сватоў, перадае, што 17-тысячная армія Сун Лян-чуна ў складзе 9 палкоў прыбыла з Фучжоу (у 50 мілях на паўднёвы ўсход ад Наньчана) ў Цзіньчжоу (у паўднёва-заходняй частцы правінцыі Фудзян). Мясцовыя камуністы наладжваюць ёй урачыстыя сустрэчы».

Зразумела, усе гэтыя тэлеграмы і паведамленьні яшчэ патрабуюць далейшага пацьвярджэньня. Ално нязумненна: працэс разлажэньня гаміндаўскіх армій з кожным днём усё паскараецца.

У Хубэі рост савецкага руху за апошнія месяцы шпоў менш імкліва, чым у Цзянсі. У той-жа час і тут чырвоная армія атрымала рад перамог. З іх найбольш значнай зьяўляецца заняцьце горада Хуанпаня, якое суправаджалася разгромам 69 белай дывізіі.

«Хуанпань, — рапартуе намесьнік камандзіра гэтай дывізіі, — глухі пацвінчны пакет. Усюды горы і лясы. Пачынаючы з 16 году рэспублікі ён ператварыўся ў чырвоны разбойніцкі раён. Пры адным успамінаньні аб ім твары байцоў бледнеюць, быццам убачылі тыгру. Дарога туды лічыцца надзвычай небясьпечнай. Тым ня менш, калі наша дывізія атрымала загад ачышчаць для ўцтікаючых Хуанпаня, мы выступілі ў той-жа дзень і гэта на гледзячы на пожаўк. Толькі пасьля цяжкага раду бояў пабраліся нарэшце да гораду. Мы ахоп'ялі яго на працягу 5 месяцаў. Ні, аднаго яна не прахоп'ила без сражэньня і кожнае сражэньне было жорстким. Уже паступіла другая палова кастрычніка, а 33-я дывізія ўсё яшчэ не магла замяніць нас. 3-я брыгада яны лася і ўшла Пма дывізія засталася апошняй. Усе шляхі аказаліся адрэзанымі. Мы ўсё-ж пратрымаліся яшчэ 3 месяцы. Паступілі халады, а ў салдат толькі летняя вопратка. Горад зусім блёкаваны. Усе запасы выйшлі. Нарэшце, нам прыйшлося адбівацца халоднай зброяй. Але сіла салому ломіць. Па зары горад пяў. Камандзір дывізіі генэрал Чао атрымаў цяжкія раненьні. Лёс яго невядомы. Жывым уцалося прарвацца толькі тысячы чалавек. Што стала з другімі, пакуль ня высьвятлілася».

Праз два тыдні, а іменна 5 студзеня, часьці 4-й чырвонай армії Куан Ці-сюна аказваюцца амаль каля сьцен Ухаўпэя які знаходзіцца ад Уханя-ўсяго толькі ў 30 клм. У контр-рэвалюцыйных колах Уханя пачалася паніка, асабліва ў сувязі з упартымі чуткамі аб тым, што Хуанпэй ужо ўзят, і што 60 тыс. чырвоных лавінай набліжаюцца да Ханькоу. Хутка, аднак, вы сьветлілася, што гутарка ідзе пра дзьве аб перадавых атрадах чырвонай армії.

«Па дакладна паведзеных мной спытаньнях, — паведамляе ханькоўскі карэспандэнт рэакцыйнай кітайскай газэты «Сіньвэньбао», чырвоныя знаходзяцца ў 5 лі (1 лі—½ клм) ад Хуанпэю. Іх сілы вылічваюцца ня ў 60, а толькі ў 10 тыс. чал. пры некалькіх тысячах кіпговак і абмежаванай колькасьці патронаў. Апрача таго, у іх ёсьць адзін аэраплян, які яко расьведвацельную службу. Сам Куан Ці-сюн на фронт яшчэ ня прыбыў».

Каб стрымаць наступленьне, хубэйскія ваенныя ўлады прыйшлося мабілізаваць часьці 4-й, 13 і 4-й дывізій. 30-я дывізія пад асабістым камандаваньнем Лі Мін-гуна ўвесь час заставалася ў самым Ухані пад прыкрыцьцём гарадзкіх сьцен.

«Плян Куан Ці-сюна заключаўся ў тым, каб аўладаць Хуанпэем, перарваць чыгуначныя зносіны і атакаваць Ухань. Потым было парашаю абыйсьці Хуанпэй і прасунуцца на поўдзень для таго, каб разьяднаць чаны сілы і кашесьці нам адно паражэньне за другім. Але і гэты плян ня ўдаўся, бо сілы ўрадавых войск аказаліся вельмі значнымі».

У сапраўднасьці справа тут ня столькі ў значнасьці ўрадавых сіл, колькі ў тым, што яны не адважыліся пакінуць добра ўмацаваных пазыцый.

8 студзеня чырвоныя часьці, якія ніхім не прасьледваліся, павольна адыйшлі на поўнач. Праз два тыдні, згодна тэлеграмы з Шанхаю ад 22 студзеня «дзьве брыгады ўрадавых войск, якія расквартаваны ўздоўж Пэкін-Ханькоўскай чыгункі ў 30 мілях ад Ханькоу і якія знаходзіліся пад камандай Лі Мін-чжуна, перайшлі на бок чырвонай армії».

У нашым агляде мы закранулі толькі два, ды і то толькі часткова, галоўныя тэатры ваенных дзеяньняў — Пэйпійскі і Хубэйскі. Аднак, ня толькі ў Пэйпі і Хубэі, але і ў Хэнані, Аньхуэі, у Фудзяне і Хунані — ўсюды ідзе жорсткая барацьба. Аграрная і антыімпэрыялістычная рэвалюцыя перажыла ідзе на кітайскіх паветах і правінцыях. Між тым гераічная чырвоная армія Кітаю, якая імкне на мацнее, з кожным днём усё больш канцэнтрыце і пашырае свае базы, рыхтуючыся да рашучых баёў.

Японія, як і іншыя імпэрыялістычныя дзяржавы на вопыце пакаліся, што 450 мільёнаў рабочых і сялянскі Кітай, які згуртаваўся вакол сваёго рабоча-сялянскага ўраду, непераможны.

Аказны рэдактар М. ГАРЫН.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ
Менск, Пляц Волі, 5.

КНІГАТУРА

ДА XIV ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

ГІСТОРЫЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.
ВАРАШЫЛЯЎ.—Сталін і Чырвоная армія. Цана 6 кап.
БРОНІН.—Ленін і Чырвоная армія. Цана 10 кап.
ТРАХІМАЎ. І ПЭРЛІН.—Яй Фабрыцыус (Жыцьцёпіс). Цана 20 кап.
БЕЛІЦКІ. — М. В. Фрунзэ. (Жыцьцёпіс). Цана 20 кап.
АРЛОЎСКІ. — Варашылаў (Жыцьцёпіс). Цана 26 кап.
В А З Ь.—Чаму мы перамаглі ў грамадзянскай вайне. Цана 30 к.
ХАРЫТОНАЎ.—Чырвоная армія—вартавы Саветаў. Цана 3 кап.
Як робіцца вайна. (Зборнік). Цана 40 кап.
ШНЕЖСКІ—Чырвоная гвардыя. Цана 40 кап.
НАУМАЎ—Вайна 1914-1918 г. г. Цана 1 руб. 15 кап.
ГОЛУБ'ЕЎ.—Фрунзэ М. В. пра характар будучай вайны. Цана 80 кап.
ПАКРОЎСКІ—Імпэрыялістычная вайна. Цана 2 руб. 20 кап.

ПАДРЫХТОЎКА ДА АБАРОНЫ.
МАРОЗАЎ.—Падрыхтоўка добрага баявога стралка. Цана 60 кап.
ЛЬВОЎ.—Баявая служба дазору. Цана 40 кап.
ВЕРЫЧАЎ—Байцу пра вайсковую хэмію. Цана 15 кап.
БЯЛОЎ.—Вінтоўка і догляд яе. Цана 20 кап.
МАХРОЎ.—Тэхніка і Чырвоная армія. Цана 30 кап.
МАКСІМЕНКА.—Памятка байцу стралку аб коньнины. Цана 25 кап.
ДЗЕРАЎЦОЎ.—Памятка чырвонаармейцу аб бронясілах. Цана 15 кап.
ВЕРЫЧАЎ.—Сродкі і спосабы паветр.-хім. нападу і абароны. Цана 1 р. 20 к.
ПЛЯКОЎ.—Памятка чырвонаармейцу аб выбуховымі вінтоўкі. Цана 10 кап.
КАКОРЫН.—Вайсковая работа партячэйкі. Цана 45 кап.
МАНІГЕЦКІ.—Як ваюць газамі. Цана 10 кап.
ДУБРОЎСКІ і ПАЎЛЮЧЭНКА.—Клюбы і чырвоныя куткі ў абароне краіны. Ц. 15 к.

МАСТАЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА.
БРОЙДЭ.—У беларускім палоне. Цана 2 р.
ЗАЛКА М.—У гасьцёх у бесьмяротных. Цана 45 кап.
ЗБОРНІК. БЕЛПАЧАФ.—Цана 60 кап.
КАЗАК.—Паэзія чырвонаармейца. Цана 50 кап.
КІРЫЛЕНКА.—Адна эпоха. Цана 35 кап.
ЛІПМАН.—Далёка ўсходняе. Цана 16 кап.
ПАМОРЦАЎ.—Пад чырвоным выпелам. Цана 60 кап.
ШАПІРА.—Ш р у б а ч к і. Цана 16 кап.

Продаж утвараецца ва ўсіх кнігарнях сэктару кнігагандлю ДВБ, райспажыўсаюзаў і Саюздруку.

„Чырвоная Зорка" К са—ад 1 г. дня. НОВЫ ГУКАВЫ ФІЛЬМ „ТОММІ"

„Інтэрнацыянал" Пач. у 2 г. дня. Гарольд Лёйд у замежным фільме ШПАРКАСЬЦЬ І НАЦІСК

„ПРАЛЕТАРЫ" Замежны фільм БЯЗРАДАСНАЯ ВУЛІЦА трагедыя ў 8 частках.

„СПАРТАК" Пачатак сэансаў: 7 г., 9 г. і 11 г. Апошняя, 2-а серыя НІ ЭЛУНГІ (Помста Крымгільды) у 10 ч. Каса—з 4 г. дня.

Беларускае Кіраўніцтва Сувязі
даводзіць да ведама ўсіх установаў і прыватных асоб, што на падставе распараджэньня Наркамсувязі,
з 15 лютага г. г.
ПАСЫЛКІ БУДУЦЬ ПЕРАСЫЛАЦЦА
бяз блянкаў саправодзіцельных адрасоў;
адправіцелі пасылак павінны пісаць яскрава адрасы на пасылках.
Каштоўныя пасылкі ад 50 руб. запечатваюцца; на квітках у прыёме пасылак, заказных лістоў, грашовых пераводаў указваецца кому дарасавана. На каштоўных пасылках ад 50 руб. і на пасылках з накладнай платай—абавязкова абазначаецца наименаваньне і адрас адпраўцелі.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА на 1932 ГОД.
„ГИХЛ" КНІГАГАНДЛЕВАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ
„НАШИ ДОСТИЖЕНИЯ"
Штомесячная Ілюстраваная часопісь.
ЗЬМЕСТ № 1 (СТУДЗЕНЬ)
Пятилетка в действии.
Две системы.
Кржижановский Г. М.—
Энергетика. — Силой единства. Пятилетка в три года. Вторая программа партии. Полтора миллиона киловатт.
Металл.— Домна и мартены.
Топливо.— Уголь. Нефть.
Машиностроение.— Список побед. Советские машины полям.
Сырьевая база.— Хлопок. Технические культуры. Каучук.
Транспорт.— Железные дороги. Реконструкция причала. На стапелях. СССР на автомобиле.
Сельское хозяйство— Величайшая реконструкция. Ведущая колонна.
Трудовые рекорды Культура и быт.— Жизнь хозяев страны. Кадры индустрии. Всеобщее обучение. Культурный под'ем народов. Газета. Книга.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на год—8 р., на 6 м.—2 руб. 50 к., на 3 м.—1 руб. 5 к. АСОБНЫ НУМАР—50 к.
Падпіска прымаецца ўсімі аддаленьнямі, магазынамі, кіёскамі і ўпаўнаважанымі Кнігацэнтру, на пошце і пістаносцамі.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА з № 1.

МІНГАРСТРАХКАСА АБВЯШЧАЕ ПЕРАРЭГІСТРАЦЫЮ)—(У С І Х)—(вайн льнізаў хатніх працаўніц гор. Менску.
Перарэгістрацыя будзе праводзіцца і ў наступныя дні
Найманьні, прозьвішчы яких пачынаецца:
На літары: А. Д. О. праходзяць перарэгістрацыю— 16 лютага
Б. І В. 17 і 19
Г. 20 і 21
Е. Ж. З. І. 22
К. 23 і 25
Л. 26
М. 27
П. 28
Р. 29
С. 2 сакавіка
Н. У. Ф. 3
Т. Ц. Ч. 4
Ш. 5
Х. Э. Ю. Я. 7
Тых, што спазьніліся на ўказаных прычынах 8
На перарэгістрацыю павінны таксама зьявіцца і тыя наймадаўкі, якія яшчэ не рэгістраваліся ў страхкасе.
При перарэгістрацыі патрэбна мець на руках кнігку наймальніка, атрыманую ад прадпрыемцы, па якой уплачваліся страхавыя ўнёскі, прадпрыемцы-наймальніка, калі ніякіх страхавых кнігак яшчэ не атрымана, або калі кнігка страхавая ў наймальніка, а не ў прадпрыемцы, або калі ўплачваліся страхавыя ўнёскі (чырвонаармейскія 1б, лютай 25) і паказаных вышэй дні ад 4 да 7 гадз. вечі.
Наймальнікі, якія не зьявяцца на перарэгістрацыю, будуць абкладзены штрафам да 100 руб.
МІНГАРСТРАХКАСА.

СКРЫГАЛАЎСКІ С.-Г. ТЭХНІКУМ
з 5-гадовым тэрмінам навучаньня па падрыхтоўцы тэхнікаў-кармавікоў
—) АБВЯШЧАЕ (—
што прыём заяў на веснавы набор 1932 г. праводзіцца з 15 лютага па 15 сакавіка 1932 г.
Прымаюцца асобы ад 14 да 25 год. скончыўшыя 7-годку, ШКМ і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы.
Пачатак заняткаў 1-го кладзьніка.
Заявы накіроўваць на адрасе: м. Скрыгалаў, Пятрыкоўская р-ну, тэхнікуму.
Дырэктар МАСАНИ.

Дрысвяцкі Лесгрангас ЗАП